Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714



Гродзіск і Астрожаны ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 36 (2834) Год LV | Беласток, 5 верасня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

БЕЛАРУСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ З-ПАД БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Вяселле — самы багаты і самы цікавы наш абрад і таму ахвотна паказваюць яго на сцэне ў час фальклорных мерапрыемстваў. Сёлета арганізатары VI Вясельнай бяседы, якая 29 жніўня адбылася ў гарадскім амфітэатры ў Гайнаўцы, рашыліся пакарыстацца вядомай белавежскай маркай. Сваё асноўнае мерапрыемства назвалі „Вясельнай бяседай рэгіёна Белавежскай пушчы", зрабілі акцэнт на гатаванне і дэгустацыю белавежскага гуляшу з дзічыны ды продаж мясцовых харчоў з-пад Белавежскай пушчы, з абодвух бакоў мяжы. Каб прыцягнуць да мерапрыемства публіку, яшчэ да вясельнай бяседы Гжэгаж Русак, кухар, расказчык і заадно старшыня Польскай палаты рэгіянальнага прадукту, са сваімі памагатымі мелі зварыць дзве тысячы літраў белавежскага супу (прыблізна пяць тысяч порцый) і накарміць ім як найбольш вясельнай публікі ды ў час імпрэзы ўстанавіць новы рэкорд Гінеса ў варэнні белавежскага гуляшу.

— Вясельнікі будуць есці, пасля бяздомных накормяць, і яшчэ ў прытулак „Цяпак" занясуць суп, каб там можна было ім сабак пачаставаць, — жартавала яшчэ да мерапрыемства жыхарка Гайнаўкі.

— Я думаю, што публіка з'есць увесь гуляш, а калі гэтага не зробіць, то будзем яго бясплатна раздаваць у дамах апекі, — скажа пазней галоўны кухар Гжэгаж Русак. — Наша работа будзе правярацца адмысловай камісіяй і толькі пазней абвесцяць ці мы справіліся з рэкордам Гінеса.

Беларускае мерапрыемства распачалося некалькі гадзін да прэзентацыі вясельных абрадаў і выступаў калектываў „Дэкада Бэнд" з Бельска-Падляшскага і „Сказка" з Беластока. У гэтым часе адбывалася падрыхтоўка кампанентаў, а пасля варэнне белавежскага супу. Пра беларускія мерапрыемствы ладжаныя ў Гайнаўцы гаворыцца па-рознаму. Адны іх моцна хваляць, іншыя кажуць, што яны не надта цікавыя. Аднак разважанні на гэтую тэму можна праверыць беручы пад увагу вялікую прысутнасць публікі ў час выступаў з беларускім фальклорам. Яшчэ перад „Вясельнай бяседай" пачаў запаўняцца гарадскі амфітэатр. Сабраныя пры сонечным надвор'і частаваліся супам і, калі пачалі аб'яўляць вясельныя абрады, над Гайнаўкай павісла хмара і лінуў вялікі дождж. Людзі сталі ціснуцца пад дах на сцэне.

— Ужо другі год запар дождж разганяў нам частку публікі, — наракалі вясельнікі з Пружан. Аднак хутка засвяціла сонца і тыя, хто не спалохаўся дажджу, пачалі вяртацца. Прэзентацыя вяселля распачалася з абраду „Апрананне маладой". Малады са старэйшым сватам і іншымі сватамі прыехалі ў амфітэатр на фурманцы і тады распачаўся абрад „Выкупу маладой". Сакавітыя дыялогі, меладычныя песні, а пасля стройныя танцы спадабаліся гайнаўскай публіцы. Фотааматары, што стаялі перад сцэнай, рабілі здымкі акцёрам з Пружан, бо ў гэтым годзе ў асноўным спевакі і танцоры з вакальнага калектыву „Пружаначка" і танцавальнага „Ойра" (Пружанскі палац культуры) паказвалі вясельныя абрады. Выступілі яны з прыгожымі беларускімі песнямі і народнымі танцамі. Многа месца адвялі яны абраду „Дарэння", які ў нас называюць „Перапіваннем". Прымаўкі і жарты маршалка рабілі гэты абрад вельмі цікавым. Гайнавяне з „Рэха пушчы" паказалі абрад „Перапой", а „Перапёлка" з ГДК выступіла з народнымі беларускімі танцамі. Да танцаў на вясельнай забаве падыгрывала гайнаўская „Тройка" (узнікла на аснове калектыву „Аўра", што займаўся ў ГДК).

На другі дзень некаторыя жанчыны не памяталі занадта песень і танцаў, якія выконваліся ў час вясельнага абраду, але маглі, напрыклад, расказаць пра прыгожую сукенку маладой. Публіка магла адчуваць сябе ў амфітэатры як пад вясельным акном, бо тут і там выходзілі да невясельных людзей і частавалі іх „гускамі". Ала Каменская з „Рэчанькі" па чарзе тлумачыла, што рабілася ў час пасобных вясельных абрадаў.

— Вясельныя абрады з нашага Пружанскага раёна і Гайнаўскага павета наогул нічым не адрозніваюцца, можа толькі нейкімі моўнымі адметнасцямі, і таму мы назвалі нашае мерапрыемства Беларускім вяселлем рэгіёна Белавежскай пушчы, — заявіў Васіль Пілюцік, кіраўнік беларускіх калектываў і заадно галоўны рэжысёр сёлетняга гайнаўскага вяселля. — Мы рашыліся запрашаць да народных танцаў у амфітэатры і на сцэну гледачоў з публікі, каб мясцовыя не толькі паглядзелі, але і адчулі сябе гасцямі вяселля.

Зараз, арганізуючы вясельныя бяседы, бацькі маладых часта звяртаюць асаблівую ўвагу на тое, што якраз павінна быць менш важным. Часта стараюцца зняць як найбольш шыкоўны рэстаран і захапіць вясельнікаў адмысловай кухняй. Аднак незычліўцы і так знойдуць хібы ў нават самым фешэнебельным вяселлі, каб пакрытыкаваць яго арганізатараў. У мінулым людзі не звярталі асаблівай увагі на тое, у якіх жыллёвых абставінах арганізуецца вяселле. Вясельнікі танцавалі тады ў клунях, вялікіх сенях або ў цёплыя дні на дварэ. Не было важным таксама харчаванне, што падавалася на стол у вялікіх місках і часта трэба было браць яго рукамі. Затое ў мінулым людзі звярталі ўвагу на музыку і песні, так як і арганізатары вясельнай бяседы ў Гайнаўцы. Вясельнікі спявалі песні нашых бабуль, танцоры запрэзентавалі даўнія народныя танцы, а музыканты іграли даўнія мелодыі.

— Спантанна прыйшла ідэя варэння белавежскага гуляшу, што стала адным з галоўных атракцыёнаў нашага вяселля, — сказаў дырэктар ГДК Андрэй Скепка.

Яшчэ да спажывання супу гайнавяне маглі пры ларках дэгуставаць вырабы народнай кухні Пружанскага раёна і Гайнаўшчыны. Быў момант, што выстраілася вялікая чарга за белавежскім гуляшом. Мае суразмоўцы згодна гаварылі, што быў ён смачны. Смачнымі былі таксама вясельныя „гускі", асабліва дзеткам, якія збіралі раскідваныя па пляцоўцы амфітэатра цукеркі.

Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гарадна • Высокае • Мосты • Сямятычы • Бельск-Падляшскі • Беласток

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com

ЗАПРАШЭННІ

Запрашаем 5 верасня 2010 г. у Нарву на

Гмінныя дажынкі ды адзначанне ХХ-годдзя самаўрада.

Праграма: 8.00-9.30: юбілейная сесія Гміннай рады (у канферэнц-зале ГУ); 10.00-9.30: падзячныя багаслужбы — 10.00 у царкве, 11.00 у касцёле, высвячэнне вянкоў; урачысты карагод з пляцу 1 Мая на стадыён, адкрыццё дажынак, уручэнне старостамі традыцыйнага бохна хлеба войту; 13.00-22.00: мастацкія выступленні — ансамбль „Чэрнічанкі" з Беларусі, хары з Ласінкі, Падляшская капэла з Сямятыч, „Нарва", „Be Happy", „Selectiv", „Dekada Band".

Шаноўныя магістры!

Маеце дыплом у кішэні і цікавіцеся беларусазнаўчай праблематыкай? У вас ёсць шанцы паглыбіць веды пра Беларусь у галінах эканомікі, дыпламатыі або перакладазнаўства і падрыхтавацца да экзаменаў на прысяжнага перакладчыка. Кафедра беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта сардэчна запрашае паступіць на паслядыпломнае навучанне. Больш падрабязную інфармацыю шукайце на старонцы

www.kb.uw.edu.pl

9 770546 196000

Дарагая цана

За час уладарання ў Беларусі Аляксандра Лукашэнкі краіна заплаціла дарагую цану. Расійскія халяўныя газ і нафта і ў выніку адносны дабрабыт, аплачаны вельмі дарагім коштам знішчэння нашай беларускай мовы і культуры. У Гродне 1 верасня ў беларускія першыя класы не пойдзе аніводзін вучань. Як магла здарыцца такая моўная катастрофа, калі яшчэ ў 1995 годзе практычна палова школ горада над Нёманам была беларускамоўнымі? Як магло так стацца за нейкіх 15 гадоў, зусім кароткі перыяд у гісторыі? Такой трагічнай сітуацыі з роднай мовай тут не было ні „за польскім часам", ні падчас фашыстоўскай акупацыі ў другую сусветную вайну, ні пры саветах. Праўда, падчас знаходжання пры ўладзе Хрушчова ў Савецкім Саюзе беларусы заспяшаліся да камунізму і „слияния языков", але нават пры Брэжневе ўлады зразумелі абсурднасць дзяржаўнай моўнай палітыкі. Пяць жа гадоў на золку суверэнітэту ў дзевяностыя гады прынеслі досыць моцную хвалю нацыянальнага адраджэння. Але карэнная змена дзяржаўнай палітыкі пасля першых прэзідэнцкіх выбараў прывяла амаль да поўнага знішчэння беларускамоўнай адукацыі. Тое, што прапануецца зараз у навучальных установах Беларусі — гэта адукацыйны эрзац, псеўдавыхаваўчы працэс, поўная дэзарыентацыя юных і маладых грамадзян краіны. І не растлумачыш такую моўную катастрофу толькі адной паталагічнай нянавісцю Аляксандра Лукашэнкі да беларускай мовы і культуры. Канешне, усё ідзе ад першай асобы дзяржавы, але ж трэба было яшчэ збудаваць цэлую піраміду на іншых людзях і выканаўчых структурах.

Не хочацца навяваць песімізму, але ў цяперашніх сумных рэаліях можа спраўдзіцца злавеснае прадказанне расійскага генерал-губернатара Мураўёва-Вешальніка: „Чаго не зможа расійскі штык, даробіць расійская школа". І не скажаш, што адукацыяй у краіне запраўляюць нейкія прыезджыя чыноўнікі-акупанты. Сярод кіроўнага звяна спрэс прозвішчы тутэйшых выхадцаў, мясцовых беларусаў і палякаў. Але такіх манкуртаў і зацятых русіфікатараў у вялізнай колькасці яшчэ не было ў нашай гісторыі. І што б яны не казалі публічна пастфактум, насамрэч робяць усё, каб нават не давесці інфармацыю пра юрыдычную магчымасць стварэння беларускамоўных класаў, не кажучы ўжо пра нейкую станоўчую ініцыятыву. А механізм стварэння беларускамоўных класаў у кожным горадзе вельмі просты. Замест тэарэтычнага права на гэта мясцовы аддзел адукацыі абвяшчае набор у канкрэтнай прэстыжнай школе, якая мае ўстойлівую станоўчую рэпутацыю. Гэта было б цалкам лагічна, улічваючы абсалютную дыскрымінацыю беларускай мовы. І, паверце, справа адразу зрушыцца з мёртвай кропкі і беларускамоўныя класы будуць створаны. І гэта не будзе нейкае гета, а зоймуць такія класы пачэснае месца.

А што ж іншы бок — а менавіта бацькі дзяцей? Чаму такая нізкая актыўнасць, чаму зараз толькі адзінкавыя заявы ў беларускамоўныя класы? Прычын тут некалькі. Адны проста абыякавыя ў гэтай справе, ім чым прасцей — тым лепш. А паколькі наўкола пануе расійскамоўная прастора, то і думаць тут няма чаго, навошта ім напружвацца. Іншая катэгорыя бацькоў робіць свой выбар свядома і прагматычна. Аддаючы дзіця ў першы клас, яны адразу думаюць пра вышэйшую адукацыю, пра тое, куды яно пойдзе паступаць пазней. А ў вышэйшых навучальных установах — таксама поўная русіфікацыя. Гродна, некалі найбольш беларускі горад краіны, ідзе ў авангардзе гэтага працэсу. Нацыянальная інтэлігенцыя тут так і не сфармавалася, дэмакратычныя асяродкі аслаблі, паўсюль вярнулася савецкасць. Высілкаў грамадскіх арганізацый, такіх як Таварыства беларускай мовы, якія раней ратавалі сітуацыю, ужо мала. Горад над Нёманам канчаткова страціў рэпутацыю беларускага Львова. А з вёсак, якія раней былі носьбітамі роднага слова, прыязджае такая ж русіфікаваная моладзь, ды яшчэ з комплексам „калгасніка".

У нейкай ступені адрозная сітуацыя ў сталіцы Беларусі Мінску. Там усё ж за гады незалежнасці з'явіўся пласт нацыянальнай інтэлігенцыі, сфармавалася пэўная беларуская супольнасць, таму і сітуацыя з беларускамоўным навучаннем лепшая. Лепшая, але не кардынальна. Беларусь за антыбеларускую палітыку нібыта сваёй дзяржавы працягвае плаціць дарагую цану.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Слова і будучыня паэзіі

Калі я параўноўваю апошнюю дэкаду свайго жыцця, час калі прыйшлося мне задэбютаваць і выдаць два першыя зборнічкі паэзіі, дык гляджу з расчараваннем на сваю паэтычную будучыню. З ноткай іроніі ўспамінаю словы пані Валянціны Швед, што прадбачвае мне будучыню ў беларускай паэзіі. Параўноўваючы сучасную моладзь з моладдзю маіх 90-х гадоў, то гэта зусім іншыя людзі, якія прадстаўляюць іншыя прыярытэты чымсьці мае равеснікі 10-15 гадоў таму. Гэта тое ж самае, як мне казала даўняя сяброўка са студэнцкіх гадоў — сёння на калідоры студэнцкага інтэрната не пачуеш гуку гітары, а шум камп'ютара. Добра памятаю, як у 1996-2000 гадах вучыўся ў бельскім белліцэі і ў тым часе каля трыццаці асоб пісала беларускія вершы або апавяданні. Тое ж самае было ў гайнаўскім белліцэі. Зараз сучасная моладзь амаль не займаецца паэзіяй, а калі чытае, дык чытае школьную літаратуру. Калі прыязджаю на аўтарскія сустрэчы, раздаю зборнічкі і нават дарэмна ніхто не хоча браць. Раптам возьме максімум некалькі асоб, дык хоць я ведаю, што яны напэўна іх прачытаюць.

А ў дзевяностыя гады стаялі чэргі каб купіць зборнічак Баены ці Шведа. А зараз нікому непатрэбны нямы крык паэтаў! А ў чым віна гэтай з'явы, разгледзім. Менавіта цяперашняе пакаленне гэта не пакаленне паэтаў ці пісьменнікаў, а пакаленне інфарматыкаў, камп'ютарных графікаў, праграмістаў, дызайнераў сайтаў, гукарэжысёраў, а ў добрым выпадку — фатографаў. Мастацтва штодзённага карыстання звязанае з камп'ютарнай тэхнікай заступіла традыцыйную літаратуру, а многім маладым інтэрнэт замяніў рэальнае жыццё. Тое, што моладзь не чытае кніг бо не мае часу, не ёсць звязанае з недахопам часу, а з тым, што сучасны малады чалавек не можа знайсці душэўнага спакою і цішыні, чаго ад нас хоча літаратура, а калі не чытае, дык не стварае сваёй творчасці. Моладзь знаходзіць важнейшыя прыярытэты чымсьці літаратура, і гэта не віна настаўнікаў, а бацькоў. Калі ў маёй працы падыходзіць да майго камп'ютара малы сынок аднаго з беларускіх літаратараў і з першага пагляду кажа якія параметры мае мой кам'пютар, дык я ў сямігадовым будучым праграмісце не бачу свайго чытача. Гэта віна сучаснага свету, якога глабальная канструкцыя вучыць нас неабходнасці камп'ютарнай тэхнікі, да якога прывыкае амаль кожны чалавек на нашай зямлі. Для сучаснай моладзі культура карцінкі становіцца больш атракцыйнай чымсьці культура слова, якое перажывае крызіс. Каб глядзець кліпы, фатаграфіі ці слухаць музыку не трэба зашмат задумоўвацца, чым пры чытанні кнігі, дзе працуюць не толькі наш погляд, але тонкасць успрымання свету і ўмеласць будавання свету, які пераказвае нам пісьменнік. Камп'ютар, забіраючы чытача, хітра крадзе ў яго не толькі час, але і чалавечую душэўнасць. Тое, што сучасная моладзь звязаная з камп'ютарам, гэта віна бацькоў. Маладая маці ўжо змалку вучыць сваё дзіця прывыкаць да камп'ютара, і на гэта мы нічога не параім. Для маладой мамы прасцей свайму дзіцяці ўключыць казку *online*, чым купіць кнігу казак ды прачытаць уголас дзіцяці. І так сямігадовае дзіця лепш ведае параметры свайго камп'ютара, чым яго бацькі. Інтэрнэт і камп'ютары забіраюць пісьменнікам чытачоў і вучаць нас, каб нашыя аўтарскія сустрэчы зрабіць больш цікавымі. Часам думаю, што будучыня не ў маіх вершах, а ў вершах Шведа, Чыквіна, Баены, якія намнога раней задэбютавалі і дасведчылі папулярнасці сярод рэальнай публікі, якой ужо выхоўваецца трэцяе пакаленне. А марка пісьменніка творыць яго майстрам мастацтва.

Аднак астаецца іншая дарога, я не сказаў бы, што простая але цікавая і больш атракцыйная для моладзі — дарога пісьменніка да чытача. Сучасны паэт не павінен толькі ўмець расказаць пра сябе і прачытаць увесь зборнік вершаў, але сумець зацікавіць публіку нейкім анекдотам або ўзяць гітару ды сыграць некалькі песень пакладзеных на яго вершы. Павінен быць таксама паэтам ды сатырыкам, а таксама акцёрам, каб сыграць кароценькую сцэнку пакладзеную на яго творчасць. Цяперашні паэт павінен быць у пэўным сэнсе адпаведнікам сучаснага шоўмена, каб інтэрактыўна зацікавіць і прыцягнуць да сябе чытацоў. Кожная форма павінна быць кароткая, каб сустрэча хутка праляцела і каб зацікавіла тых слухачоў, якія не любяць паэзіі. Гэтак жа выглядаюць аўтарскія сустрэчы на захадзе Еўропы, дзе паэзію спалучаецца з рознымі формамі мастацтва: тэатрам, аўтарскай песняй ці кабарэ. Трэба, каб сучасны паэт не быў прастарэлым і несучасным чалавекам, які паўгадзіны гаворыць пра свае дасягненні, а наступнае паўгадзіны чытае ўсе свае вершы з некалькіх зборнічкаў, а слухачы дамагаюцца канца. Так, відаць, павінен сучасны пісьменнік дапасавацца да сучаснага маладога чалавека, каб яго зацікавіць і здабыць у яго давер будучага чытача.

Юрка БУЙНЮК

Вачыма еўрапейца

Шантаж?

Нядаўна галоўны рэдактар „Нівы" ўручыў мне запрашэнне на ўрачыстасць падпісання дамовы датычнай сфінансавання дзеянняў папраўляючых стан і ахову асяроддзя рэгіёна Белавежскай пушчы. Выслаў яго Владзімеж Кусак, намеснік старшыні ўправы Ваяводскага фонду аховы асяроддзя і воднай гаспадаркі (ВФААіВГ) у Беластоку, заадно старшыня беластоцкай Гарадской рады. Дамова паміж ВФААіВГ і Нацыянальным фондам датычыць гмін, распаложаных на тэрыторыі Гайнаўскага павета, агулам дзесяці г.зв. самаўрадавых адзінак. Я быў пад вялікім уражаннем ад інфармацыі змешчанай у запрашэнні — гаворка была аб каля 75 мільёнах злотых, якія могуць быць перададзены ў форме датацыі (да 85 прац. кошту задання) і пазык (да 100 прац.). Праграма мела рэалізавацца да канца 2014 г. Найбольш грошай, бо амаль па 20 мільёнаў, мае дастацца Белавежы, Гайнаўцы (вясковай гміне) і Нараўцы. За тыя грошы самаўрад мог бы — як стаіць у інфармацыі — распачаць інвестыцыі ў абсягу рацыянальнай гаспадаркі адкідамі, рэгулявання водна-сцёкавай гаспадаркі, абмежавання спажыцця энергіі, прымяняння аднаўляльных крыніц энергіі ці арганізацыі турыстычнага руху. На практыцы справа ў пабудове мінім. прыхатніх ашчышчальняў сцёкаў, куплі сонечных батарэй для абаграванння дамоў як у Нараўцы ці прышкольнай алейнай кацельні як у Чыжах.

Пайшоў я тады на ўрачыстасць падпісання дамовы і атрымання прадстаўнікамі гайнаўскіх самаўрадаў адпаведных пісьмовых абяцанняў-прамес магчымага фінансавання мерапрыемстваў. Чакаючы старшыню падляшскага Фонду Адама Сенькі і шэфа Нацыянальнага фонду Яна Вятра, пачуў такі вось дыялог паміж парай самаўрадаўцаў дэлегаваных сюды сваімі войтамі: „Пазваніў мне ён [войт — М. Х.], каб я ехала. Маю згэтуль забраць толькі нейкі дакумент. Доўга гэта будзе? Гадзінку?" — „Мабыць, з гадзінку".

У час сустрэчы паявілася адно асноўнае „але". Грошы самаўрады могуць атрымаць, адно пры ўмове, што пагодзяцца, згодна з прапановамі Міністэрства асяроддзя, на павелічэнне Белавежскага нацыянальнага парку на 12 тысяч гектараў. Хоць ні адзін з войтаў і іх прадстаўнікоў ды прадстаўнік гайнаўскага старосты гучна гэтага не выказаў, дык ультыматум выглядаў проста як шантаж.

— Цяпер мы ўпэўнены, што калі дамо згоду на пашырэнне БНП, дык грошы будуць нам фактычна выплачаны, — сказаў пасля прыняцця прамесы войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч.

Ну вось. Гаворка толькі (?) пра згоду на пашырэнне парку. Тая залежыць, незалежна ад рэкамендацыі войтаў, ад гмінных рад. Маюць яны гэта вырашыць да канца верасня. Першыя рашэнні маюць даць рады ў Гайнаўцы і Нараўцы, у момант калі ў кіёсках пакажацца гэты нумар „Нівы".

— У выпадку калі нейкая з гмін не дасць згоды на пашырэнне БНП, грошы будуць размеркаваны паміж апошнімі гмінамі, якія да гэтага паставяцца пазітыўна, — заявіў Владзімеж Кусак.

Ян Вятр адзначыў: „Ад даўжэйшага часу мы раздумвалі, як памагчы гмінам на цяжкіх тэрыторыях, як у Гайнаўскім павеце, вылучаным з тыповай прадукцыі і падатковых дзеянняў".

І, як здавалася, тонам шантажу, спасылаючыся на супраціўленне на пашырэнне БНП, засцярог: „Гуляюць розныя эмоцыі, ды невядома, ці такая праграма паўторыцца".

А я паставіў бы пытанне, ці, калі б — як гэта акрэсліў старшыня Вятр — гміны з цяжкіх тэрыторыяў Гайнаўскага павета не пагадзіліся б на пашырэнне БНП, не мелі б шанцаў на падтрымку ў развіцці і — аб чым гаварылі чарговыя ўрады — і на тое, каб дагнаць рэшту краіны? Тым больш прымаючы пад увагу тое, што, як аказваецца, грошы на гэтую мэту могуць знайсціся ў Міністэрстве асяродзя праз Нацыянальны фонд аховы асяроддзя і воднай гаспадаркі.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

З Андрэем Хадановічам сустрэліся мы ў Сейнах, дзе прымаў ён удзел у дэбаце пад лозунгам „Чый ёсць Мілаш?", сарганізаванай Асяродкам „Пагранічча" і пасля падчас вечара ўспамінаў прысвечанага лаўрэату літаратурнай Нобелеўскай прэміі ў Краснагрудзе (месцы, у якім у маладосці Чэслаў Мілаш праводзіў канікулы ў сваіх цётак).

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

МІЛАШ МОЖА БЫЦЬ І НАШ

Андрэй Хадановіч (нар. у 1973 г. у Мінску) з'яўляецца адным з найвыдатных беларускіх паэтаў, перакладчыкаў і эсэістаў. Член беларускага ПЭН-Клуба і выкладчык літаратуры ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. У пасляслоўі да збору яго вершаў *Święta nowego rocku* („Калядны рэп"), перакладзенага на польскую мову культавым і кантраверсійным пісьменнікам з Гданьска Паўлам Гюле (таксама прымаў ён удзел у сейненскім і краснагрудскім спатканнях) той напісаў аб сваім беларускім калегу: „Выклікаў ён ува мне знакамітае ўражанне: схільны да прымяняння моўных каламбураў і жартаў, сур'ёзны ў прынцыповасці мастацтву, незвычайна начытаны ва ўсёй еўрапейскай традыцыі, таксама вельмі адкрыты на дыялог, інтэлігентны і сімпатычны. Хтосьці такі, з кім хацелася б аб'ехаць свет у восемдзесят дзён".

Гэтае інтэрв'ю было дадзенае „Ніве" (згодна з жаданнем Андрэя Хадановіча; глядзі на здымку) зараз пасля яго плавання ў возеры Голмы, у якім у юначы час плаваў таксама Чэслаў Мілаш, перакладчыкам якога творчасці на беларускую мову ён з'яўляецца.

„Ніва": — *„Мілаш — наш?" Што ў беларускім кантэксце гэта абазначае? Тут спасылаюся на Ігара Бабкова.*

Андрэй Хадановіч: — У любым разе Мілаш, канешне, не ёсць беларускаму чытачу чужы. Мілаш прэзентуе сабой такую колькасць пазітыўных вартасцей, якімі грэх не скарыстацца ані чытачу, ані перакладчыку. Па-першае — Мілаш наш блізкі сусед. А па-другое — ён быў нашым бліжэйшым аднадумцам. Бо прэзентаваў — скажам так — тую самую што Гедройц, парыжская „Культура" пазіцыю. Калі кожная з нашых краін — Беларусь, Літва, Украіна пераставалі раптам быць „усходнімі крэсамі", пераставалі быць дурацкай буфернай зонай паміж сферай расійскіх, нямецкіх, польскіх і не ведаю якіх яшчэ інтарэсаў, ва ўсім гэтым бачыўся суб'ект, які можа вырашаць свой лёс самастойна. Па-за тым Мілаш сімпатычны мне аўтар, бо ён унутры самой польскай культуры, размяжоўвае сябе следам, можа быць, за Адамам Міцкевічам, праводзячы формулу „паляк, але і літвін, паляк, але ўяўны альбо ганаровы грамадзянін колішняга Вялікага Княства Літоўскага". Часам, мне здавалася, бліжэй да канца творчасці Мілаш бліжэй атоесамляўся з рэальнай сённяшняй Літвою. Але, мне здаецца, не заўсёды, ведаючы і пра беларускія інтарэсы, і пра шматкультурнасць, пра шматмоўнасць нашай тэрыторыі. Па-за тым затым і Мілаш для кожнага чытача-беларуса блізкі аўтар, чалавек з посттаталітарнай свядомасцю, чалавек са свядомасцю асобы Сярэдняй Еўропы, краін, народаў паміж моцнымі, імперскімі суседзямі. Паэт, які сваёю творчасцю — я сёння згадваў такі верш „Трывога сон 1918" — перадае панічны страх мірнага, маленькага, у добрым сэнсе слова — чалавека перад чужою, гвалтоўнай моцай. Перадае катастрафічную свядомасць чалавека які хацеў бы ўцячы — але з гэтага свету нікуды асабліва не ўцячэ — свету гвалту, свету чужасці. Мілаш — і тут відаць ён блізкі ідэалістычным беларусам — шукае сваёй ідэальнай радзімы, якой так напраўду няма і ніколі не магло існаваць. Бо часы Вялікага княства, хочам мы ці не, мінулі, і нашы ўяўленні пра Залаты век — яны прыблізныя. Гэтаму не адпавядае ні рэальная сённяшняя ні Літва, ні Украіна, ні Беларусь, ні сённяшняя Польшча. Тым не менш — Мілаш вечны чужак, вечны эмігрант. У Варшаве ён літвін, у Францыі можа быць ужо паляк, у Злучаных Штатах Амерыкі — можа быць еўрапеец. Паўсюль не да канца свой, але гэта надае — чужасць такая — надае оптыцы позірку надзвычайную як бы пільнасць, надзвычайную уважлівасць. Такія людзі бачаць часам тое, што прадстаўнікі-аўтахтоны і не ўбачаць замыленым вокам. Такія асобы вычуленыя на абсурд. Збоку заўсёды відней. Як, напрыклад, з вуліцы з чыстым паветрам трапіць у памяшканне са спёртым паветрам. Людзі, якія там доўга знаходзяцца, гэтага не адчуваюць. Чалавек звонку добра гэта ўспрымае. Мілаш гэта чалавек як бы звонку. Але разам з тым гэта ўвасабленне адкрытасці, талерантнасці, шматкультурнасці, адкрытасці да дыялогу. Гэта ўсё робіць Мілаша „сваім" для беларусаў. Калі я кажу „сваім", гэта не значыць, што мы перацягваем нейкую коўдру, што як Міцкевічаў, так і Мілашаў хопіць на ўсіх ахвочых — палякаў, літоўцаў, беларусаў. Іншая рэч, што Мілаш ёсць наш тады калі навучымся ім карыстацца. Калі ён будзе апладняць нашу культуру. Як рэч у сабе польская ён не наш і не чужы, ён — рэч у сабе. Толькі паўстаюць цікавыя беларускія пераклады — гэта ўжо факт нашай культуры. Я хацеў бы стварыць сітуацыю, калі гэтым будуць карыстацца, калі ў Мілаша з'явяцца ўжо беларускія паплечнікі і беларускія наступнікі.

Я б тут салідарызаваўся з цытатай з Бабкова, з якой вы пачыналі: Мілаш хораша ўклаўся паміж аўтараў „Нашай нівы" дзевяностых гадоў, у польскім нумары, супольным праекце „Культуры" і „Фрагмэнтаў", дзе і я калісьці ўпершыню спрабаваў сілы як перакладчык твора „Дзіця Еўропы" Мілаша. Мілаш быў сваім цалкам і ўтульным, блізкім аўтарам, на старонках, скажам, „Крыніцы", дзевяностых гадоў, калі з'явілася яго постаць. А ў нашай крышачку, як на мяне, затрадыцыйнай культуры, культуры, якая баіцца зрабіць дзесьці крок у эксперымент, адмовіцца ад заштампаванай і абрыдлай рыфмы і гэтак далей, Мілаш, які балансаваў паміж паэзіяй і прозай, паміж традыцыяй і наватарствам, паміж патрыятызмам і касмапалітызмам у добрым сэнсе слова, паміж каталіцызмам, традыцыйнымі рэлігійнымі каштоўнасцямі і левізной усё-ткі ў палітыцы, у перакананнях, усё гэта ў суме было б вельмі карысна беларускай культуры. Я крышачку стаміўся ад кансерватараў вакол сябе, ад дурнаватай правізны, ад неталерантнасці, ад антысемітызму, гамафобіі і гэтак далей. Хацелася б, каб мае чытачы былі больш адкрытыя для іншага. Мелі крышачку больш цярпімасці ды талерантнасці, жадання зразумець іншага. Гэта ўсё, гэтыя ўсе каштоўнасці, мне здаецца, Мілаш геніяльна перадае ў сваёй творчасці, у паэзіі і эсэістыцы.

— ***Калісьці Яўген Буры, малады беларускі паэт, параўнаў Мілаша і Быкава, гаварыўшы, што абодвух спалучае лёс выгнанніка.***

— Я рады што Яўген Буры чытаў іх абодвух і мае магчымасць параўноўваць. Але думаю, што такіх параўнанняў магло б быць больш. Выгнанне для Быкава гэта толькі невялічкі перыяд ягонага жыцця, хоць і вельмі некамфортны. У мяне маса прэтэнзій да сённяшняй нашай улады, што яна, гэтая ўлада, гэты рэжым, сапсаваў Быкаву апошнія дзесяць гадоў жыцця. Але ўсё-ткі ў выпадку Мілаша гэтае выгнанне было больш глабальным, працяглым і сістэмным. Я на месцы майго малодшага калегі Яўгена зрабіў бы іншае параўнанне. Гэта аўтары экзістэнцыйнага неспакою і беспрытульнасці чалавека. Кніга Быкава па азначэнні як фільм пра „Тытанік" не можа добра скончыцца, бо сваё натхненне Быкаў як бы чэрпаў з катастрафізму. І Чэслаў Мілаш свой талент, сваё натхненне чэрпаў з гэтага катастрафізму. Мне здаецца, і ў выпадку Быкава, і ў выпадку Мілаша, пытанні тэмпераменту — яны першасныя. А потым гісторыя толькі пацвярджала іх сумныя прароцтвы. Мілаш спачатку выступіў з катастрафічнай пазіцыяй, а потым дваццатае стагоддзе, другая сусветная вайна пацвердзілі тое. Мне здаецца, што і ў выпадку шаноўнага Васіля Уладзіміравіча спосаб бачання гэтага жыцця першапачаткова катастрафічны, а II сусветная вайна і іншыя, усе сумныя падзеі, уключна з антыбеларускай уладай, толькі дадалі сумнае пацвярджэнне бачання свету Быкавым. У гэтым я б бачыў падабенства.

— ***Маю пытанне да Вас, як перакладчыка Мілаша. Цяпер вельмі шмат гаворыцца ў Польшчы, што Мілаш быў „антыпольскі". Ці вы згодны з гэтым тэзісам?***

— Тым горш для палякаў, якія гэта гавораць. Калі такая пазіцыя гучыць у шырокім дзяржаўным і далей маштабе, тым горш для тых супольнасцей, якія такую пазіцыю падтрымліваюць. На чым палягае гэтая ўяўная Мілашаўская „антыпольскасць"? На разуменні іншага, на разуменні інтарэсаў польскіх суседзяў? Дык гэта толькі плюс, мне здаецца, сапраўднай культуры. На аўтакрытыцызме! Але мне здаецца, што задача любога інтэлектуала, крытыку пачынаць з сябе, са свайго пакалення, са сваёй нацыі, са

працяг ☞10

Фэст у Семяноўцы

Летнія фэсты ў Семяноўцы (Гайнаўскі павет) заўсёды ўдалыя. Арганізоўваюць іх штогод у той самы дзень — 9 жніўня. Тады і прыязджае многа людзей — гэта жыхары Семяноўкі і шырокага наваколля, турысты і дачнікі. І надвор'е бывае ласкавае, цёплае.

Гэтак было і сёлета. На выступы прыехалі мастацкія калектывы з Мазыра (Рэспубліка Беларусь), Беластока, Гайнаўкі, Міхалова ды з Нараўчанскай гміны. Ва ўрачыстасці прынялі ўдзел, між іншым, консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Наталля Міськевіч, старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі ды радныя Нараўчанскай гміны. Усіх сардэчна прывітаў і зычыў, каб святочны пасляабедні час прайшоў у прыемнай атмасферы войт Мікалай Павільч.

Мерапрыемства пачалося ў 16 гадзін. На пачатку выступіў фальклорны калектыў „Нараўчанкі" з Нараўкі. Канцэрт вяла Кася Бяляўская.

Прыгожымі меладычнымі і жартоўным песнямі парадавалі гледачоў „Сакрэт" з Міхалова, „Цаглінкі" са Старога Ляўкова, „Луна" з Беластока і „Гэвэн" з Гайнаўкі. У тым часе Юрый Шыманюк з Семяноўкі прапанаваў са сцэны сваю нававыдадзеную кніжку пад загалоўкам „Piękno Ziemi Narewkowskiej. Współczesność, historia, legendy i mity". Ён расказаў прысутным як працаваў над падрыхтоўкай гэтага выдання, адкуль браў матэрыялы, фотаздымкі, даўнія карты з вёскамі над ракой Нараўкай, як збіраў легенды, ды чытаў цікавейшыя ўрыўкі з кніжкі

Шматлікая публіка была пад вялікім уражаннем выступленняў калектываў „Стрэчанне", „Чараўніцы" і „Сваякі" з Мазыра. Настрой усіх быў радасны і прыўзняты. Хаця канцэрт доўжыўся чатыры гадзіны, у гледачоў не заўважалася стомы, толькі радасць.

Пасля 21 гадзіны шмат маладых людзей засталося на танцавальнай забаве пад музыку гурту „Тройка" з Міхалова.

Гайнаўка

Лавачкі

Ішлі дзедка з бабуляй па вуліцы ў Гайнаўцы, прытаміліся ды прыселі на лавачцы. Калі крыху адпачылі, зноў падаліся ў дарогу.

Зараз на гайнаўскіх вуліцах даволі шмат лавачак. Усе яны прыгожыя і трывалыя. Найбольш іх у гарадскім парку ў раёне вуліц Белавежскай, Паркавай і Арміі Краёвай, у скверыку перад Гарадской управай у раёне вуліц 3 Мая, А. Зіна і Ю. Пілсудскага, а таксама па вуліцы Ліпавай. На лавачках можна прысесці там-сям па вуліцы С. Баторыя і кс. Верабея, а таксам па вуліцы Ю. Пілсудскага.

Лавачкі патрэбныя. У Гайнаўцы жыве многа старэйшых людзей. Яны і шукаюць лавачак. На іх можна паставіць і ручны багаж, а не на тратуар ці пясчаную дарожку.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

„Немагчыма правесці граніцу цераз сэрцы двух братніх народаў"

Натхненне і радасць

Віктар БУРА

8 і 9 жніўня 2010 г. нас, пенсіянераў з Гайнаўкі, запрасілі нашы сябры з Пружан — ветэраны вайны і працы. У групе з 33 чалавек давялося ўдзельнічаць і мне. З вялікай радасцю хачу падзяліцца пабачаным і пачутым з чытачамі „Нівы" і яе сімпатыкамі. А ёсць пра што расказваць!

Нядзеля, 8 жніўня. Трохі пахмурнае неба, але выглядае на тое, што днём будзе спёка. Нашы жанчыны прыгожа апранутыя, мужчыны не саступаюць бадзёрасцю. Неўзабаве пад'ехаў шыкоўны аўтобус МПК з Гайнаўкі. І гайда ў Белавежу на пагранічны пункт! Цераз мытню з польскага і беларускага бакоў мы прайшлі хутка, без клопату. Пагранічнікі і мытнікі пажадалі нам прыемнага гасцявання ў сяброў. Пераходзім мяжу пешшу. А тут нас сустракае дэлегацыя з Пружан з кветкамі, на чале з дырэктарам Пружанскага палаца культуры Васілём Курачынскім. Моцныя поціскі рукі, пацалункі, хлеб ды соль. Займаем разам месца ў суперaўтобусе з кандыцыянерам і ўсімі выгадамі XXI стагоддзя.

Наша дэлегацыя з Польшчы прымае ўдзел у вялікім мітынгу ў дрымучай Белавежскай пушчы ля магілы беларускіх і польскіх змагароў. „Превыше солнца сияют погибших здесь имена". Многа народу, моладзі. Гудзяць фанфары. Заняў сваё месца духавы аркестр Пружанскага палаца культуры.

Вядучыя маладыя Алена Анісеня і Віктар Тарасюк выступаюць са словамі: „Дарагія сябры! Паважаныя польскія госці. Стала добрай традыцыяй кожны год збірацца тут, каля помніка, які сімвалізуе аб'яднанне чалавечых лёсаў беларускага і польскага народаў, каб ушанаваць памяць родных, дарагіх і блізкіх людзей — беларускіх і польскіх актывістаў, расстраляных у 1941 г. на гэтай святой зямлі, у Белавежскай пушчы".

Слова далі старшыні нашай дэлегацыі Мікалаю Чыквіну — старшыні нашай пенсіянерскай арганізацыі. Пасля выказваліся жыхары вёскі Крыніца Марыя Іванаўна Баршут і старшыня раённай рады ветэранаў Мікалай Якаўлевіч Дулько.

У сваёй прамове намеснік старшыні Пружанскага раённага выканаўчага камітэта Мікалай Пятровіч Кудравец сказаў на беларускай мове:

„Паважаныя сябры! Дарагія нашы польскія госці. У гэтым годзе 9 мая мы адзначылі 65 гадавіну вялікай перамогі савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Вайна — самае вялікае зло, зло замешанае на крыві, слязах, попеле і пакутах. Вялікая айчынная вайна стала суровым выпрабаваннем не толькі для савецкіх людзей, але і для народаў цэлага свету. У гэтай вайне плячо ў плячо за сваю свабоду і незалежнасць змагаліся ўсе дзяржавы і народы антыфашысцкай кааліцыі, у тым ліку беларусы і палякі. Змагаліся і гінулі. Але толькі інтэрнацыянальная еднасць народаў з чэсцю вытрымала націскі фашызму. У нашай памяці назаўсёды застануцца светлыя імёны загінуўшых. У 1941 годзе з 29 ліпеня па 2 жніўня на гэтым месцы было расстраляна больш чым 130 мірных жыхароў навакольных вёсак Крыніцы, Чадзель, Папялёва, Боркі, Белы Лясок Пружанскага раёна і суседняй Белавежы з Рэспублікі Польшча. Кожны год у пачатку жніўня мы збіраемся ў гэтым святым месцы, каб зноў і зноў успомніць закатаваных землякоў і ўшанаваць іх памяць. Помнікаў і абеліскаў, падобных гэтаму, у Польшчы і Беларусі вялікае мноства. Яны стаяць на зямлі як незагойныя раны і закліканы служыць адной мэце: нагадваць людзям аб тым, што ў вайне спазнаецца сапраўдная цана міру. Берагчы яго — задача не толькі вялікіх палітыкаў, але і нас — простых людзей. Мы павінны памятаць і рабіць усё дзеля таго, каб другая сусветная вайна засталася назаўсёды апошняй у гісторыі нашых народаў. Выказваю шчырую ўдзячнасць усім удзельнікам мітынгу. Ніякія жыццёвыя буры і нягоды не могуць змяніць нашых адносін да гэтага месца. Дзякуй усім за вашу пашану і памяць!"

Пасля выступлення Мікалая Кудраўца прагучалі гімны РБ і РП. Хвілінай маўчання ўшанавалі прысутныя памяць загінуўшых беларускіх і польскіх актывістаў. Вядучая сказала: „Калі б прысвяціць хвіліну маўчання кожнаму з дваццаці мільёнаў загінуўшы на вайне, працягвалася б яна 39 гадоў".

Назіраю за прыбыўшай публікай, моладдзю. У шмат каго слёзы ў вачах, хустачкі ў далонях. Усе ў вялікім смутку ускладваюць вянкі, жывыя кветкі, запальваюць знічы. Вельмі ўсхваляваўшы ўсіх прысутных ускладвае вянок пяцігадовая прапраўнучка Івана Козака Маша Кулакова. „Слава вам, храбрые! Слава, бесстрашные! Вечную славу поёт Вам народ. Доблестно жившие, память о Вас никогда не умрёт".

Пасля мы паехалі ў горад Пружаны, якому сёлета спаўняецца 578 гадоў. Нас вельмі ўрачыста сустрэла перад Палацам культуры дэлегацыя ветэранаў вайны і працы з калектывам „Чырвоная гваздзіка". Пасля кароткай прагулкі нас запрасілі на абед. Вечарам у прасторнай зале — выступленне хору, якім кіруе Святлана Машкало. Яна і сама, майстар па баяне, прыгожа спявае. Спявалі ўсе пружаншчане і гайнавяне, танцавалі пад гукі аркестра Палаца культуры. Сваё пачэснае месца заняў у гэтыя два дні наш дуэт з Дубін — акардэаніст Пётр Скепка і салістка Анна Карэтка. Налаціліся сяброўскія знаёмствы паміж жыхарамі Пружан і Гайнаўкі, а гэта, так сказаць, усім неабходнае, патрэбнае — без сяброўства жывецца сумна, цяжка, душа становіцца загубленай...

На другі дзень мы паехалі ў Брэст. Нашымі экскурсаводамі па Пружанах і Пружаншчыне, а таксама па Брэсце і ваколіцы былі дырэктар Васіль Курачынскі і працаўнік аддзела культуры ў Пружанах Руслан Кніга. Па дарозе едзеш нібы плывеш ці ляціш — ні адной калдобіны. Назіраю палі, сенажаці, лугі, дзе пасвяцца вялікія статкі сытых кароў. На палях усё сабранае, пасеяны новыя культуры, кукуруза вышынёй больш чым два з паловай метра. Прыпынкі размаляваныя ў нацыянальныя ўзоры. Абочыны дарог абкошаныя. Чысціня. У Брэсце наведалі мы музей-крэпасць, усклалі кветкі і запалілі знічы, паглядзелі помнікі культуры. Горад Брэст прыгожы, каляровы, чысты, людзі прыгожа апранутыя, ветлівыя. У магазінах можна ўсё купіць і цэны даступныя. Пасілкавацца нас звадзілі ў шыкоўны рэстаран, на еўрапейскім узроўні. Па дарозе да мяжы наведваем яшчэ тры меншыя гарады. Нашы сябры з дома культуры ў Пружанах давозяць нас на пункт развітання пад „каралеўскім" дашком, дзе расстацца цяжка з сябрамі. На мяжы памежныя службы распытваюць нас пра ўражанні. Мы адказалі, што нас прымалі вельмі шчыра, сардэчна, багата.

Калі мы прыехалі ў нашу Гайнаўку, павятовы горад, так як і Пружаны, пабачылі мы тое, што назіраем штодзённа. Адчуваецца ў нас недахоп дбайнасці ўлад за наш не вельмі чысты горад. Варта нашым чыноўнікам з'ездзіць у Беларусь, пабачыць як там дбаюць пра культуру, выгляд гарадоў, пасёлкаў, дарог, выгаду мясцовых і замежных турыстаў і г.д. „Які пан, такі і крам".

За пасрэдніцтвам „Нівы" хачу вельмі падзякаваць пружанскім уладам, у тым ліку Васілю Іванавічу Курачынскаму, за запрашэнне пенсіянераў з Гайнаўкі на гасцінае турнэ па Пружаншчыне і Брэстчыне.

Паэтычныя сустрэчы ў трохкутніку

Тэкст і фота
Міры ЛУКШЫ

— Трэба весці нармальную, вельмі пазітывістычную працу. Рабіць тое, што Богам ці прыродаю нам дадзена, тады тыя творы, кнігі, зборнікі будуць дзейнічаць. А калі да нас будуць прыхіляцца і яшчэ і яшчэ нашыя сябры і пісьменнікі, наша праца для роднага слова будзе мець плён, — сказаў старшыня Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа" на сустрэчы ў Гудзевічах сёлетняга лета. Была яна часткай святкаванняў і працягам „Паэтычнага трохкутніка", сарганізаванага мастакамі слова пры дапамозе Культурнага цэнтра Беларусі (КЦБ) ды ў рамках шматкультурага фестывалю ў Гродне. Дзякуючы падтрымцы КЦБ адбыліся ў Беластоку дзве сустрэчы ў сакавіку і ў маі 2010 г. членаў БЛА „Белавежа" з пісьменнікамі з Гродна і Брэста. 6.06.2010 г. у зале гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Яўхіма Карскага беластоцкія аўтары прынялі ўдзел сярод пісьменікаў з усяе Беларусі, Украіны, Расіі ў свяце паэзіі. Прафесар Чыквін упэўнены: — Для нас сталася вельмі істотным, што адкрыліся новыя магчымасці, новыя шляхі. І гэтага не бачыўшы было б крыўдна. Я дзякую менавіта спадару Эдуарду Швайко, прадстаўніку Культурнага цэнтра Беларусі. Гурт беларускіх пісьменнікаў Беласточчыны з'яўляецца нейкім такім абласным аддзяленнем саюза па-за межамі Беларусі. Ну, што ж, у сэнсе фінансавым, сэнсе магчымасцей, у плане культуры мы не раўня да Рэспублікі Беларусь. Беласток, усё ж такі, хоць гэта, скажам умоўна, і беларускі горад, на беларускай тэрыторыі, але ён не мае гэтай хвалі, ці гэтага подыху — такога чыста беларускага. Ён ужо запольшчаны вельмі моцна. Мы, пэўна, будзем арганізаваць гэты трохкутнік, калі прыйдзе чарга да нас, але каб нас разумелі, што мы будзем нашмат скрамней. Так што я, загадзя, прашу прабачэння... Калі тычыцца нашых сустрэчаў, пэўныя думкі ўжо даспелі. Наступным разам (2011 г.) сустрэнемся ў Брэсце. Мабыць, будзем планаваць такія сустрэчы кожны год. Добра было б такую сустрэчу рабіць не ў кантэксце іншых планаў, не так, як тут, у межах фестывалю культур — мы тут трохі гінулі. Свята само сабою было цудоўнае. Але нам у такой колькасці калегаў пісьменнікаў, у пашыраным крузе, добра было б пасядзець, пагутарыць, больш сустрэцца з чытачамі, са студэнтамі, можа, зрабіць літаратуразнаўчую міні-канферэнцыю, не з нейкімі доўгімі дакладамі, і прыгарнуць не толькі паэтаў, але і празаікаў, і драматургаў. Каб быў жывы абмен, каб не замыкацца ў крузе сваіх паклоннікаў. Бо гэта небяспечна, калі чуеш толькі пахвалу. Вельмі дзякую Людміле Кебіч за арганізацыю гэтай сустрэчы. Яна ляжыць нейкім падмуркам для далейшых нашых сустрэч. Мы адчуваем патрэбу сустрэч паэтаў Беласточчыны, Берасцейшчыны і Гродзеншчыны. Нам трэба гэта для яднання. Мне хацелася б, каб праз такія літаратурныя асяродкі, людзей незвычайна таленавітых, адукаваных, людзей, якія маюць шмат што сказаць, весці нармальную, вельмі пазітывістычную працу...

Пісьменнікі з Беластока, Гродна і Брэста пад музеем Максіма Багдановіча

Сапраўды, беларуская тутэйшая літаратура, хоць, як кажа Сакрат Яновіч ды за ім іншыя, „другая пасля польскай у Польшчы", мала вядомая і тут, а і ў Беларусі. Наколькі разбіраюцца там нават хоць у напісанні прозвішчаў аўтараў, у якіх не адна ўжо кніга на роднай мове, можа сведчыць афіцыйная інфармацыя пра адну з першых сустрэч з „Трохкутніка: „30 мая б.г. члены дэлегацыі прынялі ўдзел у паседжанні Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа". Дадзеная сустрэча з'яўляецца першай падобнага кшталту паміж дзвюма арганізацыямі. З боку аб'яднання „Белавежа" прысутнічалі старшыня арганізацыі прафесар Ян Чыквін, члены аб'яднання — Галіна Твараовіч, Віктар Швед, Юрка Баена, Міра Лукша, Уладзімір Саўчук, Яўгенія *Максімюк*, Юрка Буйнюк і іншыя. Падчас сустрэчы былі абмеркаваны пытанні дзейнасці літаратурных аб'яднанняў Беларусі і Польшчы, дасягнута дамоўленасць аб развіцці далейшага супрацоўніцтва, правядзенні сумесных літаратурных мерапрыемстваў, выданні зборнікаў твораў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. У якасці магчымага накірунку сумеснай дзейнасці на бліжэйшую перспектыву быў абраны фестываль беларускай паэзіі, які можа быць праведзены ўжо ў наступным годзе". Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве РБ, які дзейнічае ў Беластоку, вельмі канкрэтна дапамагае беластоцкім пісьменнікам (падтрымліваючы таксама фінансава выданне трох кніг у год), і не скажаш, што абмяркоўвае сваю дапамогу ў залежнасці ад таго, якога саюза беларускіх пісьменнікаў — „старога" ці „праўладнага" — пісьменнік з'яўляецца сябрам. У госці ў Беласток прыязджаюць і на сустрэчах выступаюць таксама аўтары незалежна ад членства, таксама ў адной дэлегацыі. Ды ўспрыняцце і разуменне таго, што робім мы тут на Беласточчыне, не азіраючыся на іншых, таксама не ад нас залежыць. Вось прыклад з блога (пасля гэтыя заўвагі былі надрукаваны ў шматтыражцы) аднаго з гасцей, Валерыя Гапеева: „Літаратурнае аб'яднанне „Белавежа" асаблівае. І асаблівасць яго ў тым, што яно аб'ядноўвае літаратараў самых розных поглядаў. Скажам так: тых, хто вітае сённяшнюю Беларусь, і тых, хто лічыць сваімі сябрамі беларускіх апазіцыянераў. Унікальнасць самой „Белавежы" трымаецца на цвёрдым правіле яе старшыні, прафесара ўніверсітэта Яна Чыквіна: ты можаш мець любыя палітычныя погляды, але тут — толькі літаратура... Буду шчырым: не самыя сяброўскія позіркі асобных членаў таварыства было нам добра відаць, як і адчувальны халадок іх кароткіх рэплік падказваў нам, што нас прынялі ці за палітычных агітатараў... Анатоль Крэйдзіч расказваў пра дзейнасць абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі без аніякай хітрасці. На пытанні адказваў шчыра. І пра заснаванне аблвыканкамам літаратурнай прэміі імя Калесніка, і пра тое, што аблвыканкам фінансаваў выданне Літаратурнай карты Берасцейшчыны, куды ўвайшлі ўсе літаратары — ніхто іх тут не дзяліў па саюзах. Як ніхто не дзеліць па саюзах і пры прысуджэнні той самай прэміі аблвыканкама — у мінулым годзе яе атрымалі, напрыклад, у намінацыі „Паэзія" сябры якраз не Саюза пісьменнікаў Беларусі... І адразу — пацяплела. Амаль фізічна адчулася, як знікла напружанне. Тут усе зразумелі, што мы прыехалі не агітаваць, не пераманьваць да сябе, не сеяць недавер, не ўпікаць. Мы прыехалі з прапановай".

Што, можа, і ў мяне заўважыў брэсцкі пісьменнік на сустрэчы ў „Белавежы" недружалюбны позірк, ці мо, скажам, і ў Міхася Андрасюка — у нас такія пушчанскія вочы! Пра свае палітычныя погляды „белавежцаў" не разважаюць самі „белавежцы" нават у сваёй кампаніі, прынамсі не спрачаюцца. Можа, меркаваў па нашым узросце? Калі пра гэта гаворыць (і пасля распаўсюджвае) „выкшталцоны" аўтар, дык што гаварыць пра нэчытатых-нэпысатых? Такіх, што добра калі возьмуць у рукі хоць газету? Ці ведаюць яны хоць пра тое, што на Беласточчыне жывуць беларусы? Што гавораць тут яшчэ па-беларуску? Ну, што ж, займаемся сваёй „пазітывістычнаю працай", да якой заклікае прафесар Чыквін. Сустракаемся. Чытаем сабе беларускае і іншае слова. Каб паэту зусім не ўпасці духам, можна сказаць што яны гэтак маюць і ў нас, і ў той Амерыцы... Адно нас ратуе: вера ў жывучасць роднага слова. А сума кутоў трохкутніка — 180 градусаў. Ды мо ўсё гэта — зусім наадварот?..

На спартыўнай ніве

Чаромхаўскія футбалісты

7 жніўня на спартыўным стадыёне „Орлік" у Чаромсе праходзіў футбольны турнір за кубак войта гміны. Арганізатарам імпрэзы была каманда „Калеяж", якая рашыла выпаўніць вольны час жыхарам пасёлка на прыхадское свята Ганны. У спаборніцтвах удзельнічала сем камандаў: пяць пасёлкавых з Чаромхі-Станцыі, „Раміс" з Беластока і каманда з Орлі. Кубак войта атрымала каманда „Калеяж I", якая перамагла каманду сапернікаў „Калеяж II" вынікам 1:0. Трэцяе месца ўзялі госці з беластоцкай каманды „Раміс". Ганаровыя статуі з пераможнай каманды атрымалі: найлепшы стралок Кшыштаф Каравай і варатар Лукаш Раманчук. У канцы сустрэчы футбалісты сустрэліся пры вогнішчы пры печанай каўбасцы. Трэнерам „Калеяжа" з'яўляецца Лукаш Шабалоўскі.

* * *

У рамках акруговых спаборніцтваў 22 жніўня на спартыўным стадыёне „Калеяж" у Чаромсе сустрэлася каманда гаспадароў з футбалістамі з Васількава. Першая палова матча закончылася вынікам 3:1 у карысць „Калеяжа". У другой палове на пятнаццатай мінуце здарылася непрыемнае здарэнне, калі футбаліст з Васількава пасля атрыманай „жоўтай" картачкі пачаў спрэчку з бакавым суддзёю, а пасля дайшло да рукапашнай сутычкі. На гэта вострa рэагаваў галоўны суддзя, які спыніў матч. Балельшчыкам гэты эпізод не спадабаўся і кляймілі футбаліста з Васількава за хуліганскія паводзіны.

(ус)

Беласток

Больш веласіпедных сцяжынак

Сёлета ў Беластоку пабудуюць 10 кіламетраў новых дарожак для веласіпедыстаў. Неўзабаве закончаць пабудову звыш 600-метровага адрэзка дарожкі ўздоўж вуліцы Мілаша. Без перашкод будзе можна ехаць на ровары па вуліцах Каліноўскага і Барсучай. Кіламетровай даўжыні будзе веласіпедны шлях уздоўж вуліцы Вейскай ды новага адрэзка вуліцы Свентакшыскай да вуліцы ген. Мачка.

Новымі сцяжынкамі паедуць любіцелі веласіпедаў па вуліцах: Мазавецкай, кард. Вышынскага, Звежынецкай, Каперніка, Чанстахоўскай, ген. Берлінга і Прадукцыйнай.

Апрача таго, для тых, хто любіць катацца на веласіпедзе, беластоцкія гарадскія ўлады пабудуюць яшчэ 40 новых стаянак для ровараў, між іншым, перад кінатэатрам „Форум" па вуліцы Легіяновай, па вуліцы Гротгера, Складоўскай, св. Роха, Дамброўскага і Варшаўскай, на скрыжаваннях вуліц: Падарэўскага і Пуласкага, Пілсудскага і Жабяй, Міцкевіча і Ажэшкі, Сянкевіча і Аградовай, св. Мікалая і Гарохавай ды Пілсудскага і Сянкевіча.

Новай інфраструктурай цешацца веласіпедысты: там, дзе ёсць сцяжынкі, там бяспечна. Зараз шматлікія жыхары Беластока перасядаюцца на ровары ў суботы і ў нядзелі.

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Алесь БАДАК

Хто там стукае ў акно?

— Стук-стук!
— Хто там, хто там?
Хто там стукае ў акно?
На дварэ ўжо ноч даўно!
— Адчыніце,
Гэта воўк.
Я прыйшоў да вас
Здалёк.
Ад сарокі я пачуў,
Быцам тут жыве хлапчук,
Што заўсёды крыўдзіць
Меншых,
Што смяецца
Са слабейшых.
Дзе ён,
Гэты ваш герой?
Забяру яго
З сабой,
Хай сярод лясное цішы
Ваўчанят маіх калыша.
— Што ты, што ты,
Шэры воўк!
Памыліўся ты,
Браток.
Хлопчык наш
Не крыўдзіць меншых,
Не смяецца
Са слабейшых.
Разам з імі ён
Гуляе.
Калі трэба —
Памагае.
Вельмі ціхі
Наш сынок.
Памыліўся ты,
Браток.
— Стук-стук!
— Хто там, хто там?
Хто там стукае ў акно?
На дварэ ўжо ноч даўно!
— Гэта стукае
Мядзведзь.
Адшукаў ваш дом я
Ледзь.
Гаварыла мне сарока,
Што жыве тут недалёка,
Быццам сын у вас
Гультай,
На ўсе просьбы
Толькі
„Ай!
Не хачу!
Не буду!
Потым!"
Трэба гнаць з яго
Ляноту.
Пасаджу яго
Ў мяшок,
Аднясу
У наш лясок.
Хай сярод лясное цішы
Ён дзяцей маіх калыша.
— Што ты, што ты,
Добры мішка!
Нешта блытаеш ты
Крышку.
Бо сынок наш
Не гультай.
У любога запытай.
Ён і маме дапаможа.
Ён і тату дапаможа.
Ціха-ціха за акном.
Вунь пайшлі
Мядзведзь з ваўком.
І каго яны шукаюць,
Спаць уночы замінаюць?
Не здагадваешся?

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Школьнікі з Дубін

Новыя прапановы „Зоркі"

На 1 верасня сіноптыкі прадказваюць дажджы. Такія звесткі палохаюць сучасных людзей. Нашы продкі больш аптымістычна ўспрымалі такія навіны. Яны верылі, што калі ў важны дзень пойдзе дождж, гэта добры знак. Ён прадказваў добры плён і ўраджай. Вядома, ідзе пра вашы ацэнкі ў школе і поспехі ў конкурсах.

У школе ўсё часцей вяртаемся да мудрасцей продкаў. Іх веды здзіўляюць пранікнёнасцю, вучаць як вырасці на сумленнага чалавека, прадказваюць небяспеку. Разам з новым навучальным годам мы таксама рыхтуем вам новыя прапановы. Ад верасня мы пачнем друкаваць казкі народаў свету. Будзем прапанаваць вашай увазе вершы для конкурсу „Роднае слова" і словы сучасных беларускіх песень — каб вы самі змаглі іх спяваць на конкурсах і мясцовых мерапрыемствах (мы адкрыты на прапановы чытачоў).

Рыхтуем таксама зорчыну фотагалерэю ў віртуальным варыянце. Школьнікі, якія яшчэ не атрымалі „Жывінак з глыбінкі", будуць мець магчымасць сарганізаваць сустрэчу з аўтаркай кніжкі.

Зразумела, будзем працягваць самыя папулярныя рубрыкі, напрыклад, польска-беларускую крыжаванку ці рэпартажы са школ і гімназій, інтэрв'ю з вучнямі і моладдзю. Традыцыйна, вялікую ўвагу мы адвядзем вашай творчасці. Будзем вас суправаджаць у літаратурным конкурсе беларускай паэзіі і прозы. У планах XXV Сустрэчы „Зоркі" — журналісцкія майстар-класы для аўтараў допісаў і асоб зацікаўленых прафесіяй журналіста.

Новы 2010/2011 навучальны год будзе шчодры ў конкурсы і сюрпрызы. І галоўнае: мы спадзяемся што з кастрычніка „Зорка" зноў стане каляровай!

Ганна КАНДРАЦЮК

Беларуская народная казка

Муха-пяюха

Жыла-была муха-пяюха. Мела яна каляску і шэсць камароў. Запрэгла муха-пяюха камароў у каляску ды паехала на пагулянку. Едзе яна дарогаю, едзе шырокаю — бяжыць мышка:

— Добры дзень, пані! Як паню звацьвелічаць?

— Я муха-пяюха. А ты хто?

— А я па паліцах скрабатуха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — скача жабка:

— Добры дзень, панове! Як вас звацьвелічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. А ты хто?

— А я па сажалках рагатуха.

— Сядай, паедзем разам. Едуць яны дарогаю, едуць яны шырокаю — на галінцы вавёрка:

— Добры дзень, панове! Як вас звацьвелічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. А ты хто?

— А я па елках скакуха.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — бяжыць заяц:

— Добры дзень, панове! Як вас звацьвелічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. Па елках скакуха. А ты хто?

— А я праз дарогу скок.

— Сядай, паедзем разам.

Едуць яны дарогаю, едуць шырокаю — ідзе воўк:

— Добры дзень, панове! Як вас звацьвелічаць?

— Муха-пяюха. Па паліцах скрабатуха. Па сажалках рагатуха. Па елках скакуха. Праз дарогу скок. А ты хто?

— А я галодны воўк. Усіх вас паем.

Дашкольнікі з Беластока

Фота Міры ЛУКШЫ

Пачулі гэта камары, падняліся ўгору і паляцелі разам з каляскай. А галодны воўк паляскаў зубамі і пайшоў далей ні з чым.

Фота Міры ЛУКШЫ

Шчасце і вадзяныя цёкі

Адной з першых рэчаў, якая прыцягнула маю ўвагу ў маім пакоі на Сустрэчах „Зоркі", была вялікая калекцыя газет „Свет навукі". Яны змяшчаюць шмат інфармацыі на тэму прыроды, палітыкі і мастацтва. Такія часопісы намнога цікавейшыя чым школьныя падручнікі.

Невыпадкова ўласнікам газет з'яўляецца Барыс Казлоўскі — чалавек-„аркестр". З ліку іншых людзей вылучае яго здаровы падыход да жыцця. Хаця я сутыкнулася з ім год таму, надалей у яго прысутнасці адчуваю вялікі прыток ведаў. У спадара Боры шмат арыгінальных думак наконт свету і здароўя людзей. Ён часта крытыкуе сучасны свет і падыход людзей да працы. Яму не падабаецца, калі людзі нічога не робяць, а толькі наракаюць. Ён сказаў нам, што нельга паддавацца дрэнным настроям, а толькі трэба дзейнічаць — тады будзем шчаслівымі людзьмі. Словы спадара Боры гучаць вельмі шчыра. Слухаючы іх, можна сапраўды памяняць падыход да жыцця.

Не ўсё, аднак, залежыць ад людзей. Мы нават не ўяўляем як моцна ўздзейнічае на нас свет прыроды. Мяне зацікавіла справа вадзяных цёкаў каля Ляўкова. З-за іх баліць галава і безупынна хочацца спаць. Пансіянат пана Боры быццам пазбаўлены вадзяных цёкаў. Гаспадар паказаў нам як з дапамогай лазы шукаць шкодныя для здароўя месцы. Аказваецца, што дзеля гэтага не трэба чарадзея-лазаходца. На сто чалавек можа толькі адзін не мае здольнасцей знайсці такія месцы.

Падмацаваныя тэорыяй мы самі пачалі шукаць вадзяныя цёкі ля пансіяната Бора-Здруй. Бо, нягледзячы на тое, што бачылі і чулі, нам чамусьці хацелася спаць. І дзіва — мы адкрылі вадзяныя цёкі. Праўда, мы не хацелі паверыць у тое, што бачылі. Бо калі глянеш на спадара Казлоўскага, гэты чалавек — доказ сілы, здароўя і творчага падыходу да жыцця.

Пасля пэўнага часу я зноў пачала думаць пра вадзяныя цёкі. Наогул я веру ў тое, што бачу. А тут...

З часам мы зразумелі сэнс нашага адкрыцця. Так! Вадзяныя цёкі неабходныя для пансіяната Бора-Здруй. Інакш як сэнсоўна растлумачыць яго назоў!

„Цікаўнасць",
Наталля Кандрацюк-Свярубская

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Барыс Казлоўскі паказвае свой сонечны гадзіннік

Вершы Міры ЛУКШЫ

КОЛЯ

Распусціўся Коля на сваволі.
У бабулі Олі гуляў у полі.
Бегаў з ветрыкам у перагонкі,
з пеўнікам
рэкорд пэўна біў,
аж лопалі перапонкі.
Коля, у школу час пара,
а гэта — не гулянка.
Ужо ўся дзецярня
на школьным ганку.
А хто так крычыць на калідоры —
(і тут Колю не спыніць!)
бы певень хворы?
Коля, Коля, ужо даволі!
На стадыёне дасі сабе волю!

Музыка з кайфам

Чарговая цэгла *Камяніцы*

Сёння пацягнемся на другі бок мяжы. „Пацягнемся", бо ад Беластока трэба пераехаць нейкіх 300 кіламетраў ды ўзяць неабыякавы багаж з сабой, бо свой музычны вопыт, асабліва ў галіне жанру фольк. Цяжка не заўважыць, што летні сезон з году ў год багацейшы ў колькасць рознага кшталту мастацкіх падзей. Як грыбы восенню, так летам вырастаюць канцэрты, агляды, фестывалі. Яшчэ пару гадоў таму ў Беларусі цяжка было разлічваць на багацце опэнэраў, але ўжо зараз і там гэты натуральны працэс паступіў.

Патрэбная ідэя, крыху грошай і ўжо можна выпрабаваць сябе ды публіку. Так зрабілі арганізатары першай эдыцыі фестывалю *Камяніца*, які прайшоў на мінулым годзе пад Мінскам. Экзамен прайшоў паспяхова і 4 верасня гэтага года ў Дзяржаўным музеі архітэктуры і побыту пройдзе ўжо яго другі выпуск. Па меркаваннях як арганізатараў, так і зорак музыкі, падтрымліваючых фестываль Алега Хаменкі з „Палаца" і Івана Кірчука, лідара „Тройцы", фольк-музыка вельмі перспектывічная. У свеце гэта зразумела, у Беларусі гэтае разуменне яшчэ прыйдзе. На радзімай сцэне ёсць багацце выканаўцаў, якія будуць гэты патэнцыял выкарыстоўваць, таму ўзгаданыя музыкі не толькі зайграюць, але дапамагалі ў адборы выступоўцаў ды і дапамогуць выбраць лепшых выканаўцаў, якія сваю візію фольк-музыкі запрэзентуюць у час *Камяніцы*.

Дагавораная транспартная лінія будзе давозіць сімпатыкаў фольк-музыкі ў Музей, які знаходзіцца ў пару кіламетрах ад Мінска. На месцы будзе можна пахарчавацца, паглядзець на працу майстроў рукадзелля, самому паспрабаваць напрыклад фехтавання, але ў асноўным — паслухаць добрай музыкі. Пакуль гэты фестываль на этапе развіцця. На сцэне прэзентавацца будуць беларускія закаханыя ў фольку выканаўцы. Сёлета будуць гэта м.ін. побач „Тройцы" і „Палаца", „Акана", „GUDA" ці „Бан Жвірба". Пакажуцца маладыя групы, якія пачынаюць прыгоду з фолькам. У будучыні марай арганізатараў — пераўтварыць *Камяніцу* ў фэст міжнароднага значэння.

Тройца

basovka

Польска-беларуская крыжаванка № 36

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 32:

Як, груша, шкура, ода, гняздо, яр, буслянка, сан, столь, мара. Ява, густ, шанс, ял, зяць, Гродна, радок, аса, ар, абарона.

Узнагароду, запісную кніжку, выйграў: **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



Гродзіск і Астрожаны

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Гмінны Гродзіск падаецца вонкаваму госцю незвычайнай мясцінай. У цэнтры не надта вялікай вёскі, каля расхадных дарог, нацэліліся ў неба, быццам касмічныя ракеты, культавыя вежы. Культавых аб'ектаў у гэтай мясцовасці — як і прыстоіць дамінуючаму тут хрысціянству — тройца. Пасярэдзіне невялічкая старая драўляная яшчэ царкоўка ўніяцкага выраду, а абапал яе высяцца ейныя нашчадкі, а па сутнасці продкі — мураваныя ўжо царква з касцёлам.

Чаму продкі, хаця малодшыя? Бо ж уніяцтва з'яўляецца дзіцяткам згулянага ў 1596 годзе берасцейскага царкоўна-касцельнага вяселля, дзе палоханая басурманамі адна з царкоўных дачок пайшла ў абдымкі магутнага канфесійнага суседа. А памагутнеўшы за чарговыя дзесяцігоддзі заступнік ейнай традыцыі запатрабаваў у 1839 годзе вяртання назад усяго ў агульнасці тутэйшага пасагу. А нашчадкі? Бо яны пайшлі ад яе пазней...

Завялікіх ведаў у мяне пра распаложаны на нашай заходняй „камчатцы" Гродзіск у мяне не было. Таму я першыя свае крокі дзеля здабывання ведаў пра гэтую мясцовасць накіраваў у бок праваслаўнай плябаніі. Праўда, мой нюх спрацаваў паводле свецкага ўяўлення... Менавіта царква ў Гродзіску выглядае вельмі запушчанай, з яе абсыпалася амаль уся фарба, што ў нашу эпоху, калі шматлікія цэрквы аснашчаюцца залацістымі купаламі, навяло на мяне здагадку пра кволасць і беднасць гэтага прыхода. Зараз за царквой прысеў старэнькі але прасторны драўляны будынак, запушчаны бадай яшчэ больш чым царква, і ён падаўся мне жылым яе дапаўненнем. Калі я адкрываў прашклёныя дзверы ў сенцы, у той жа час адкрыліся наступныя за імі дзверы і маладая жанчына ветліва паінфармавала мяне, што плябанія ў іншым месцы, дакладна распавёўшы ейныя каардынаты. Аднак у адносна новай мураванцы плябаніі на мой час нікога не было.

У цэнтры Гродзіска невялічкі парк, з адной лаўкай, якая і так здаецца быць непатрэбнай сіроткай. Будынак Гміннай управы ў Гродзіску не надта прыкметны. На адным са стэндаў перад ім заўважыў я вокладку манаграфіі пра Гродзіскую гміну. На калідоры гміннай установы заклапочаная яе працаўніца крыху разгубілася маім зацікаўленнем згаданай кнігай, таму спытаў я яе пра гмінную бібліятэку; бібліятэка ў Гродзіску поруч Гміннай управы. Ветлівая бібліятэкарка, для якой наша „Ніва" не была ніякай загадкай, мела кніжку пад рукой...

Царква ў Гродзіску

Крыжы ў Дрохліне

Найстарэйшы цяпер сакральны аб'ект у Гродзіску, драўляная ўніяцкая царква, была пабудавана ў 1709 годзе, значыць стаіць яна там ужо больш трохсот гадоў. Верагодна, што ў той сам час была пабудавана побач яе і асобная званіца, якая таксама захавалася да нашых дзён. Варта адзначыць, што ў палове XVII стагоддзя быў прыход з царквой у Тварагах-Рускіх, што каля Пэрлеева, які po zniszczeniu się tej cerkwi i przejściu na unię katolicką, як пішуць аўтары згаданай гміннай манаграфіі, спыніў сваё існаванне; магчыма, што po zniszczeniu się tej cerkwi ўзнікла патрэба пабудаваць храм у іншым месцы і сталася гэта менавіта ў Гродзіску. Магчыма таксама, што ў Гродзіску храм усходняга абраду быў ужо і раней, бо ж сама назва мясцовасці наводзіць думку, што яна існавала намнога раней і адыгрывала істотную ролю ў наваколлі, заняўшы месца акурат пасярэдзіне дарогі паміж слаўнымі Драгічынам і Браньскам...

У 1726 годзе ў складзе Гродзіскага прыхода былі м.інш. наступныя мясцовасці: Гродзіск, Макаркі, Дрохлін, Смарклічы... Сам Гродзіск быў мясцовасцю невялікай — Міхал Балінскі так пра яго пісаў у 1845 годзе: „Mieścina ta, należąc 1775 r. do Ossolińskich, liczyła 31 domów podymne opłacających". Тамашні ўніяцкі храм у 1840 годзе стаў праваслаўным. У 1891 годзе ў Гродзіску была ўзведзена новая, мураваная царква паводле тыповага ў той час для нашых зямель праекта; старая драўляная царква перастала выконваць сваю ранейшую ролю і ў 1923 годзе тагачаснымі ўладамі была афіцыйна перададзена каталікам і ў тым жа годзе была там устаноўлена асобная каталіцкая парафія; раней Гродзіск быў у складзе парафіі ў Рудцы. У 1926 годзе, ужо ў якасці касцёла, храм быў адрамантаваны і будынак атрымаў новы, бляшаны дах заміж ранейшай, працякаючай ужо ў той час гонты. Служыў ён чарговым вернікам да 1990 года, калі быў здадзены ў карыстанне новы гродзіскі касцёл — амаль сто гадоў пасля царквы...

Каля кіламетра ад Гродзіска ў заходнім напрамку канчаюцца ўраджайныя палі і пачынаецца лес. Незвычайны гэта лес, бо ў прынцыпе дубовы — напэўна ён пасляваеннага вывадку. Лес гэты прасціраецца амаль да Дрохліна.

У Дрохліне, пры расхадных дарогах, засцерагальнае ад нячыстай сілы месца — крыжы. Адзін з іх на валуне, на якім таксама намаляваны крыж з двойкай арантаў; пад малюнкам невыразны ўжо кірылічны надпіс, верагодна з 1911 года — значыць яму будзе год да круглага юбілею. Побач яго лацінскі крыж на цэментным пастаменце з 1916 года, а над імі высіцца масціты драўляны крыж... У 1938 годзе ў Дрохліне было 124 праваслаўных вернікаў, калі ў самім Гродзіску 223, а ў Мірынаўцы толькі 59. Дарэчы, каля кіламетра на захад ад Дрохліна на лясной акраіне стаіць крыж на цэментным пастаменце з надпісам: „Спаси Господи люди Твоя. Сей крестъ соор. стараніемъ дрохлинскаго общества 1939 3 юня".

Астрожаны падаюцца мне ціхай вёскай, хаця ў ёй марыйны санктуарый дыяцэзійнага рангу. Драўляны астрожанскі касцёл пабудаваны чвэрць тысячагоддзя таму — у 1758 годзе. І гэта трэці па чарзе касцёл, узведзены ў гэтай парафіі, заснаванай у палове XV стагоддзя; першы храм быў пабудаваны на месцы, дзе ўласнікам Астрожан мела паказацца Матка Божая. Абраз Астрожанскай Багародзіцы, напісаны каля 1600 года, лічыцца цудадзейным. Трыста гадоў таму, у 1710 годзе, кругом смяротнае жніво збірала моравая эпідэмія, а ў Астрожанскай парафіі заглянула яна толькі ў адну хату...

Сотню гадоў таму, у 1909 годзе, Напалеон Роўба так пісаў пра Астрожаны: „Ostrożany, wieś i dobra w pow. bielskim, gub. grodzieńskiej, przy drodze z Siemiatycz do Ciechanowca. Parafjalny kościół drewniany; w wielkim ołtarzu obraz dobrego pendzla Matki Boskiej z Dzieciątkiem Jezus".

Каля двухсот метраў за касцёлам распаложаны могілкі. Адметная там высокая брама, пабудаваная дзвесце гадоў таму. На ёй красуюцца вытрымкі — свайго роду афарызмы — з рэлігійнай творчасці Яна Аўдара, астрожанскага пробашча з 1931-57 гадоў; шматлікія яго вершы сталі асновай мясцовых песень.

Санктуарый у Астрожанах разбудоўваецца — гэта такі знак нашага часу; абрастае ж рознымі збудаваннямі і Грабарка... А вось іншым знакам часу паказваецца заняпад колішніх форм сельскага гаспадарання. Будынкі былога эскаэру каля Смарклічі зарастаюць рознай флорай, адкрываюцца ўсімі праёмамі на свет, быццам чакаючы звонку паратунку. І некім некалі пастаўлены там драўляны крыж таксама здаецца верна спадарожнічаць ім у прах...

Брама астрожанскіх могілак

Только идиот в Беларуси не будет говорить по-русски

А. Г. Лукашенко, Прэзідэнт РБ

ЛЁС ІДЫЁТА

Алесь ЯЖЭВІЧ

Жыццё маё было багатым на паездкі. За апошнія пятнаццаць гадоў я паспеў пабываць у многіх краінах Еўропы. Маючы лінгвістычную адукацыю, я не ўпускаў ніводнай магчымасці шчыра пагутарыць з прадстаўнікамі розных еўрапейскіх нацый і народнасцей, балазе моўных перашкод не было: з немцамі, аўстрыйцамі, швейцарцамі, бельгійцамі (фламандцамі) і галандцамі я размаўляў па-нямецку; з палякамі, літоўцамі, украінцамі, чэхамі, славакамі і славенамі — на роднай беларускай і крыху па-польску; з італьянцамі — збольшага па-англійску, з рускімі і нярускімі ў Расіі — па-руску. Я замілавана ўслухоўваўся ў меладычнасць кожнай незнаёмай мне мовы і параўноўваў яе са сваёй. А яшчэ гэта быў час пасля сумнавядомага рэферэндуму 1994 года, ініцыяванага прэзідэнтам. Належны да кагорты нязгодных, я пытаўся ў іншых народаў ці можна ахвяраваць роднай мовай і гістарычнай дзяржаўнай сімволікай дзеля эканамічнага дабрабыту? Еўрапейцы адзінадушныя: не! Палякі зачастую дадавалі, што гэтакі эканамічны дабрабыт можа быць толькі ў хляве! Напалову паляк, з імі я салідарны.

З Беларуссю выходзіць замінка. Але я так моцна люблю сваю мову, створаную беларускім народам, родныя мне герб Пагоню і бел-чырвона-белы сцяг, што адмаўляюся верыць у чэснасць рэферэндуму ад 1994 года. Сама задума змяніць мову і сімвалы — злачынная ад пачатку і мусіць быць тэрмінова выпраўлена самім беларускім народам. Пасля развалу Савецкага Саюза ўсе сёстры па прымусе памянялі свае карыкатурныя дзяржаўныя сімвалы на сапраўдныя, гістарычныя, але ж ніхто з іх потым (акрамя нас!) назад да штучных сімвалаў не вярнуўся. Мы — самыя хітрыя? Выходзіць, не ўсе. Асабіста я ў 1989 г. вывесіў бел-чырвона-белы сцяг над гарвыканкамам у сваім горадзе Валожыне ў ноч перад першатравеньскай дэманстрацыяй. Міліцыя шукала, хто гэта зрабіў, — але мяне тады пранесла. Праз нейкі месяц я прыняў удзел ва ўстаноўчым з'ездзе БНФ у Літве — ніколі не забуду, што падвёз мяне, студэнта, у Вільню на сваёй машыне паважаны Артур Вольскі. У 1990 г. я быў абраны намеснікам старшыні ТБМ імя Францыска Скарыны ў Валожыне. На ладжаным ТБМ Чарнобыльскім шляху пад гітару выканаў самадзейную песню на верш Янкі Купалы „Паўстань!". Словы дакору, што гэтым вершам шляхціч Купала як хлебам-соллю вітаў польскую армію Пілсудскага, я заўсёды лічыў беспадстаўнымі. Так, у 1920-х гадах яна белым арлом пераможна лятала над савецкай Беларуссю, але ж „сагнаць з сваіх палёў чужых бадзяг" паэт заклікае не Арла, а Пагоню:

Паўстань з народу нашага, Ваяк,
І волатам на вогненным кані...

„На Беларусі Бог жыве" — пісаў наш слынны Караткевіч. Калі з Божага блаславлення нацыянальны трыколер горда ўзвіўся над домам урада і стаў афіцыйным дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь, — я не ўтрымаўся, каб не пахваліцца, што сцяг у Валожыне — мая работа! Гэта не мінула адбіцца пасля наступнай забароны бел-чырвона-белага сцягу, — зразумела. Кантрольнымі праверкамі мяне руйнавалі як прыватнага прадпрымальніка. Кантроль кантрольных праверак і новыя штрафы мне недвухсэнсоўна далі зразумець, што прыйшоў час пісаць заяву на спыненне прадпрымальніцкай дзейнасці.

Для рускамоўнай улады беларускамоўныя людзі — гэта ў воку стрэмка, гэта яркае сведчанне ейнай антынароднасці ў Беларусі! У маёй нацыянальнай зарыентаванасці ўлада бачыць варожасць і шкодніцтва — вынікае лагічным, што мне яна плаціць адпаведнай манетай. Чорныя вароны белую пэцкаюць брудам і гоняць са стаі! Права на працу — гэта акт прызнання асобы дзяржавай; велічыня аплаты залежыць ад ступені запатрабаванасці. З двух прэтэндэнтаў на адно рабочае месца, адзін з якіх свядомы беларус, а другі — рускамоўны іншаземец, — працу атрымае апошні. Я падрабляў прыватна, але не здрадзіў мове і не перайшоў на русский язык. Здрада мове — гэта здрада духоўнасці, і змяніць сваю мову на іншую — гэта памяняць сваю душу на чужую! Ігнараванне, грэбаванне мовай — той жа грэх! Начальства, кіраўнікі розных форм уласнасці ў нас скрозь рускамоўныя. Што добрага можна чакаць ад улады, што абымаецца з Люцыфэрам? Беларускамоўным — нічога! Паслухайце яшчэ раз пісьменніка Кастуся Цвірку (газета „Народная воля" артыкул „Немцы"): „Не, высокі чыноўнік наўрад ці папракне цябе за беларускую мову, наадварот, можа нават пахваліць. Але ў той жа час у душы пакрывіцца, як ад зубнога болю, і сам сабе зазначыць: не „свой" — такі яму непатрэбны, будзе толькі раздражняць гэтай „мовай". За маю беларускую мову мяне „хвалілі" не дзясяткі — сотні разоў! Толькі я ўразумеў: часта чынуш раздражняе не ўласна мова, а ўсвядомленая неабходнасць яе адпрэчыць, што само па сабе амаральна і гнюсна. У многіх фірмах мне, беларускамоўнаму, давалі зразумець альбо казалі наўпрост, што іхні начальнік — заўзяты прыхільнік прэзідэнта, — і таму ў мяне няма шанцаў.

Болей за жыццё я люблю сваю сінявокую мову — і мне шкада тых, каго мовай курчыць. Разам з другімі беларускамоўнымі я „пранясу яе святлом незгасальным у сэрцы сваім" — няхай гэта будзе лішняй нагодай усумніцца ўсім прыстойным людзям планеты ў тым, што беларусы дабравольна выракліся сваёй мовы. Увесь свой вольны час я аддаю служэнню яе вялікасці мове, шмат працую над дасканаленнем лексічнага запасу, лацінкі. Вывучыўшы замежныя мовы і ў арыгінале пазнаёміўшыся з геніяльнай творчасцю еўрапейскіх майстроў слова — я зараз ведаю, як падкрэсліць прыгажосць сваёй роднай. Я пішу аповеды, з'едлівыя і злабадзённыя вершы пра вынішчэнне мовы праз носьбітаў, на гістарычныя тэмы, раблю вершаваныя пераклады з нямецкай. Зараз заняты напісаннем аповесці „Янычар супраць Мовы". Беластоцкая газета беларусаў Польшчы „Ніва" прыгожа і годна друкавала мае творы на сваіх старонках: без цэнзуры, надуманых рэдкалегійных карэктур, што прычэсваюць твор пад выданне, нівелюючы аўтарскі стыль, — за што я ёй моцна ўдзячны. Тутэйшыя афіцыёзныя выданні мае творы амаль не друкуюць — бо палітычныя, бо пра мову. Харошыя людзі з выдавецкіх СМІ мне шматкроць падказвалі: ты пішы на мове пра Вялікую Айчынную вайну, пра прыроду, пра росквіт незалежнай беларускай дзяржавы, — толькі не трэба на мове пісаць пра мову! Але ж у сваім беларускім доме мова з маючай быць гаспадыні фактычна і практычна зведзена да нікчэмнай прыстасаванкі! Каму пяяць дыфірамбы? З гэткім парадкам я ніколі не пагаджуся, чаго б дарагога мне гэта не каштавала...

Сонца свяціла ўжо па-асенняму, калі ў 2009 г. мы пераехалі бліжэй да сталіцы — настальгія па Мінску, дзе нарадзіліся дзеці Вітаўт і Вікторыя. Жыллё атрымалі службовае, таму жонка пайшла працаваць у калгас. Думалі браць дзялку, каб будавацца. Паміж капеечнай работай на месцы і абяцанай высокааплатнай у Мінску я выбраў другое. Уладкаваўся афіцыйна, працаваў як мае быць, але грошай не заплацілі. Рэвалюцыйным шляхам народ, згуртаваўшыся, заваяваў права на працу; права на зарплату мы заваёўваем кожны паасобку. Я падаў на фірму ў суд. Зараз ведаю не з гавэнды, што такое беларускае правасуддзе: мой былы працадавец яго можа назваць самым гуманным на свеце!

Доўгі час стаю на біржы працы. У анкеце напісаў, што беларускамоўны, што гатовы бадай на любую самую цяжкую ці адказную работу, каб толькі атрымаць сярэдні па РБ заробак у эквіваленце 500$, дэкларавaны прэзідэнтам рэспублікі. Работы я не баюся, я пагадзіўся на ўсемагчымыя камандзіроўкі, ненармаваны рабочы дзень, на вахтавы метад, на работу за граніцай — хоць на край свету, хоць у падзямелле — без розніцы куды, абы толькі ведаць, што пасля чэснай працы будзе чэсна выплачаны абмоўлены заробак. Я шукаю работу з зарплатай — а гэта ў Рэспубліцы Беларусь успрымаецца як нахабства! З прапанаваных біржай працы работ мой заробак склаў бы палову ад дэкларавaнай сярэднямесячнай толькі ў тым выпадку, калі б да яго прыплюсаваць яшчэ і жончыну зарплату. Даць згоду на такую работу азначала б адсунуць праблему ў дальні кут, схавацца ад яе, падобна страўсу, але не вырашыць. Тлумачэнне адно: каб упісацца ў прадзяржаўныя пастулаты беларускамоўны чалавек мусіць быць бедным абавязкова! Сам я рэгулярна купляю рэкламныя газеты, шукаю працу праз інтэрнэт, наведваю мінскія цэнтры занятасці насельніцтва. Дарэмна. Ужо з парога, як правіла, на маё „Дзень добры" чуецца „До свидания". Памечанага мовай „чужака" не могуць узяць на работу.

— Только идиот в Беларуси не будет говорить по-русски!

Хіба гэта не дырэктыва вертыкалі і кіраўнікам усіх суб'ектаў гаспадарання? Хіба засталіся яшчэ мастадонты, каму няўцям, што кар'ера іх пасядае перш на лаяльнасці, чым на прафесіяналізме?! А давайце зменім фармуліровачку:

— Толькі ідыёт у Беларусі не будзе гаварыць па-беларуску!

Тады на завітальнае „Дзень добры!" гучэла б запрашальнае „Калі ласка!". Прынамсі, спакваля ўсё менш станавілася б тых, хто думае іначай. Як шкада, што сёння гэта — утопія! Сёння нянавісць да беларускай мовы, да яе носьбітаў узведзена ў Беларусі ў ранг дзяржаўнай ідэалогіі, вакол якой мусіць быць з'яднана ўсё насельніцтва краіны, быццам дружна адпрэчыўшы беларускамоўных беларусы насамрэч змогуць адчуць сябе задаволеным, шчаслівым народам! Сумны факт, але апошнім часам ніводзін беларускамоўны кандыдат у дэпутаты не выбіраецца ў парламент рэспублікі. Гэткі ж шукальнік працы знойдзе яе не хутчэй, чым надарыцца выстраліць стрэльбе, што вісіць на сцяне.

Гэты час запомніцца маім дзецям. Яны, апранутыя ў паношаныя касцюмчыкі, з ранніх год адчулі пачуццё людской непрыязні. Калі ў школе знікала нейкая дробязь — дзеці хорам крычалі: „Гэта ўкраў Вітаўт!". Ну, пэўна ж, Вітаўт. Хто ж яшчэ можа скрасці, калі не Вітаўт? Да гэтага часу ў Віта нічога ўкрадзенага не выявілі — а шукалі прылюдна! — толькі дзе гарант, што заўтра ў яго не знойдуць сапраўдную бомбу?!

Годнасць чацвертакласніцы Вікі растоптвалі старшакласніцы, пераймаючы яе ў калідорах школы. З яе ціха злаславілі, на яе глядзелі абразліва, з яе злобна смяяліся — са школы дзяўчынка вярталася ні жывая, ні мёртвая... Мы, бацькі, не былі пасіўнымі назіральнікамі.

Сваім дзецям я прывіваю любоў да беларускай мовы не як да дысцыпліны, што патрэбна здаць на экзамене і потым забыць за незапатрабаванасцю, а як да культуры, з якой ім ісці па жыцці, па якой і можна будзе пазнаць адукаванага і інтэлігентнага беларуса. Я не забіраю ў дзяцей светлай будучыні — я свята веру ў яе і ў перамены да лепшага!

Кожны мужчына ў жыцці павінен зрабіць тры рэчы: пасадзіць дрэва, пабудаваць дом і выгадаваць сына. Але як — без работы? Сказаць, што ў дзяржаве работы няма, азначала б саграшыць супраць ісціны: рабочых вакансій вельмі шмат. Як праўда і тое, што абсалютная большасць работ — мізэрнааплатныя. Працуючы на такой рабоце існаваць можна толькі пры ўмове, што дзяржава падтрымае датацыяй. Дзяржава абяцае яе выплачваць; прэзідэнт заклікае павялічыць насельніцтва ў тры разы; а афіцыйныя прафсаюзы ў мэтах стымуляцыі нараджальнасці прапанавалі спаганяць падатак з бяздзетных мужчын. Niech żyje nędza — Давайце пладзіць жабрацтва! Паэт у прозе і філосаф у паэзіі Віктар Гюго жабрачае існаванне паставіў у першы рад пакут чалавечых. А законы ў нашай краіне распрацаваны так мудра, што, да прыкладу, неабходную грашовую падтрымку на дзяцей нашай сям'і могуць выплаціць... толькі на трэці год пасля звароту!

Калі мне робіцца зусім тужліва — я ўключаю беларускае тэлебачанне. Там амаль усё па-руску, але ж так прыгожа!..

3 ☞ працяг

МІЛАШ МОЖА БЫЦЬ І НАШ

сваіх каштоўнасцей. Час ад часу ладзіць праверку на вашывасць, даруйце, свайго. Дзякуй Мілашу, што ён сапраўдны польскі патрыёт! Інтэлектуал мусіў бы сказаць Чэславу Мілашу: „Дзякуй за гэта! За праверку нашых местачковых комплексаў, сусветным, еўрапейскім культурным кантэкстам".

— Гаворыцца, што Мілаш у свае апошнія гады вельмі памагаў беларускім інтэлектуалам. На чым палягала, у чым праяўлялася гэтая дапамога?

— Можа быць самім фактам свайго існавання, можа быць самім фактам неабыякавасці да таго што ў нашых культурах адбываецца. Зразумела, што ён пазітыўна вітаў незалежнасць і самастойнасць гэтых краін. Я сёння [у час дэбаты „Чый ёсць Мілаш?" у Сейнах — М. Х.] згадваў эпізод на адной з міжнародных канферэнцый, калі вялікі сябра і паплечнік Мілаша Іосіф Бродскі спрабаваў падкалоць украінскую інтэлектуалку Аксану Забужка; пытаўся: „Украіна?.. А дзе гэта?". Разгубленая Забужка не знайшла нічога лепшага, як звярнуцца па дапамогу да прысутнага Чэслава Мілаша, які з прыемнасцю падтрымаў яе. А Мілаш гэта ўжо аўтарытэт, якога Бродскі ўжо слухаў. Я думаю, што тое самае магло б здарыцца з Беларуссю. Мілаш ведаў, якой мовай казалі простыя людзі ў яго па суседстве, на Віленшчыне.

— А будзе канец беларускага свету, як тое можна вычытаць паміж радкамі Мілаша пішучага пра „канец свету"?

— Чаму — беларускага?

— Бо ўсё гаворыцца пра канец беларускай мовы, канец беларускай літаратуры... А затым і беларускага свету?

— Мяне больш цікавіць канец чалавека як такога. Свету як такога. Безумоўна, заняпад любой мовы — гэта для мяне вялікая падзея са знакам мінус, як і выжыванне любой мовы — вялікая падзея за знакам плюс. Я не рэдукаваў бы сусветнай глабальнай сістэмы толькі да нашай беларускай пясочніцы. Мне здаецца, што кажучы пра канец свету, Мілаш меў на думцы штосьці больш глабальнае і ўніверсальнае... Хоць, відавочна, глабалізацыя, скажам, імперыяльны ўціск слабейшых культур і гэтак далей гэта прыватныя праявы гэтага сістэмнага, сусветнага ўжо канца свету, ужо апакаліпсісу. Але без перабольшвання з беларускімі страхамі. Там дзе двое людзей гавораць сваёй мовай, там дзе муж і жонка вырашаюць выхоўваць дзіця на сваёй мове, там нічога катастрафічнага, мне здаецца, гэтай маленькай мове, у тым ліку беларускай, не пагражае. Ніякі Мілаш не выратуе беларускую мову замест саміх беларусаў. З другога боку — ніякі Лукашэнка не растопча беларускую мову без згоды, без пасіўнай, рабскай, ідыятычнай згоды саміх беларусаў. Калі гэтай згоды, пасіўнасці, ідыятызму будзе менш, будзе ўсё ў парадку. Мне крышачку абрыдлі гэтыя размовы, нашае беларускае ныццё айчынных псеўдаінтэлектуалаў пра лёс нашай гаротнай бацькаўшчыны, бо яны не бачыць за лёсам нашай гаротнай бацькаўшчыны іншых яе праблемаў. Ведаю літаратара, вельмі знакамітага, ён паўдзельнічаў у перакладзе „Рухнамы" Туркмен Башы на беларускую мову; калі яму рабілі закіды, ён казаў, што „я не на расійскую, я на беларускую перакладаў, я памнажаў беларускае слова, а паглядзіце на Туркмен Башы, як ён дбае аб сваёй туркменскай радзіме". Разумееце, дыктатар-не-дыктатар, абы сваю культуру падтрымліваў! Часам ёсць падазрэнне, што пэўнай колькасці нашых культурных дзеячаў, найперш постсавецкім беларускім літаратарам, дай костку ў выглядзе падтрымання беларускай мовы, а ў дужках чытайце: „іхнай гарантаванай прафесіі", іхнага гарантаванага кавалка хлеба — і яны спакойна заплюшчаць вочы на ўсё астатняе: абы па-беларуску гаварылі, а якія бздуры гавораць — ужо няважна! Абы па-беларуску, а якая дыктатура!? У гэтым сэнсе наш рэжым, дыстанцыяваўшыся ад беларушчыны, дае гэтай беларушчыне — але здаровай, неканфармісцкай — пэўны шанц. Шанц атаясаміцца з больш сімпатычнай мне (і не толькі мне) палітычнай, культурнай і гэтак далей пазіцыяй. Я так крыху сумбурна пра гэта кажу. Не рабіце з мовы храма! Мяне вучылі на першым курсе ўніверсітэта, што мова гэта сродак чалавечых зносін. Часам важней думкі і пазіцыі, якія гэтая мова выражае. Тое самае датычыць эстэтыкі паэзіі, часам важнейшая сама прыгажосць якая праз гэтую паэзію паўстае. А ў астатнім я — як мае калегі — гатовы ўсякім чынам змагацца за лінгвістычныя правы нашай мовы і палітычныя правы яе носьбітаў. (Тым больш яны, гэтыя правы, рэгулярна парушаюцца).

(працяг будзе)

Адметнасцю цяперашняй беларускай плацежнай сістэмы ёсць адсутнасць у паўсядзённым абарачэнні манет. У параўнанні з суседнімі краінамі, дзе ў металічным выглядзе існуюць грошы, капейкі, капійкі ці санцімы, жыхары Беларусі трымаюць у сваіх кашальках выключна папяровыя сродкі разлікаў. Выгодна гэта для дзяржаўнага станка, які ці друкуе грошы, ці не, могуць пралічыць спецыялісты, але відавочна, што папяровыя грошы псуюцца і выходзяць з абарачэння значна хутчэй, чым металічныя.

Дзякуючы таму, што манеты здольныя захоўваць свой выгляд цягам стагоддзяў, сёння мы можам вывучаць па іх наша мінулае. Таксама старажытныя манеты маюць і вялікую каштоўнасць як прадметы даўніны. Ну а пра нумізматычную каштоўнасць металічных грошай добра распавядаецца на сайце „Манеты беларускай даўніны", які належыць Беларускаму нумізматычнаму клубу.

Сайт месціцца па адрасе **http://groshyk.ru**. Выглядае ён даволі арыгінальна — асноўныя колеры — шэры і белы, што надае выяўленню нейкую строгасць і акадэмічнасць. Апошняя рыса асабліва праяўляецца ў прадмове, якая месціцца на галоўнай старонцы. Яна напісаная звычайнымі беларускімі словамі, але, здаецца, аўтары не надта парупіліся пра тое, што прачытаць яе паспрабуюць не толькі тыя людзі, якія прызвычаіліся чытаць навуковыя працы.

„Асэнсаванне нумізматычнага матэрыялу, што застаўся беларускаму народу ў спадчыну ад яго слаўных продкаў, патрабуе пэўнага досведу, кругагляду і любові да сваёй краіны і яе гісторыі, — пішуць у прадмове аўтары сайта. — Разам з тым падобная праца не можа быць выкананая адным-двума людзьмі, бо неабходныя яшчэ строгасць і спеласць ацэнак, чаго нялёгка дамагчыся пры аднаасабовым поглядзе. Зрэшты, гэтак можна сказаць пра любую справу, мэтай якой ёсць дабрабыт і абазнанасць супольнасці людзей, народа".

Будова сайта таксама арыгінальная. Асноўны тэкст на кожнай старонцы месціцца з левага боку выяўлення. Пасярэдзіне — выйсці на рубрыкі сайта пад назвай „Матэрыялы", а з правага боку — так званая навігацыя, якая змяшчае выйсце на галоўную і некаторыя іншыя старонкі.

„Матэрыялы" ўтрымліваюць даволі многа артыкулаў, адны назвы якіх інтрыгуюць наведвальніка. „Манеты старажытнай Русі", „Пражскі грош на Беларусі", „Развіццё грашовых сістэм", „Першыя беларускія рублі", „Фальсіфікацыя манет" — гэта далёка не поўны пералік рубрык, дзе распавядаецца пра манеты, якія чаканіліся тут альбо былі завезены на тэрыторыю Беларусі, як развіваліся грашовыя стасункі і як яны змяняліся.

На старонцы „Фальсіфікацыя манет" ходзіць пра тое, як за старадаўнія манеты рознага роду махляры выдавалі ўласныя падробкі, а таксама пра такое злачынства як фальшаваманетніцтва, якое без перабольшання прэтэндуе, каб называцца майстэрствам.

Як бачым, грошы гэта не толькі „пагарджаны метал", але і крыніца творчага натхнення. Доказам такой высновы ёсць рубрыка „Вершы пра грошы".

Але сайт пакуль мае пэўныя недапрацоўкі. Прыкладам гэтаму ёсць рубрыка „Карысныя спасылкі", якая абяцае выйсці на цікавыя рэсурсы, але не змяшчае ніводнага з іх.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Багаты жнівень

Падвядзенне вынікаў жніўня хочацца пачаць з футбола. Клубнай камандай месяца можна назваць барысаўскі БАТЭ, які ў другі раз у сваёй гісторыі будзе выступаць у групавым турніры Лігі Еўропы. Балазе лёсаванне, якое вызначыла ў сапернікі далей каманды „Дынама" (Кіеў, Украіна), АЗ (Алкмаар, Нідэрланды) і „Шэрыф" (Тыраспаль, Малдова) дазваляе спадзявацца на поспех і далей. Што датычыць нацыянальных дружын, то зноў на вышыні апынуліся беларускія весляры — чарговых 7 медалёў на чэмпіянаце свету. У агульным заліку Беларусь стала 4-й пасля Венгрыі, Нямеччыны і Канады пры ўдзеле ажно 75 краін. Далей вылучаем пашыраны спіс лепшых па прозвішчах.

1. Дзяніс Гаража (веславанне) у Познані на чэмпіянаце свету перамог у каноэ-адзіночцы на дыстанцыі 500 м.

2. Сяргей Мартынаў (кулявая стральба) другі раз у сваёй кар'еры стаў чэмпіёнам свету. Ён перамог у практыкаванні лежачы з малакаліберай вінтоўкі на першынстве ў Мюнхене.

3. Раман Петрушэнка і **Вадзім Махнеў** (веславанне) выйгралі золата ў парнай байдарцы на дыстанцыі 500 м. А разам з **Аляксеем Абалмасавым** і **Артурам Літвінчуком** занялі другое месца ў экіпажы на дыстанцыі 1000 м.

4. Андрэй і **Аляксандр Багдановічы** (веславанне) сталі сярэбранымі прызёрамі на адрэзку 1000 м на каноэ-двойцы.

5. Алег Юрэня (веславанне) стаў бронзавым прызёрам на дыстанцыі 1000 м у байдарцы.

6. Вадзім Каптур і Цімох Гардзейчык (скачкі ў ваду) узышлі на бронзавую прыступку п'едэстала чэмпіянату Еўропы. Заканамернасць гэтага выніку Каптур пацвердзіў і ў індывідуальным спаборы, паказаўшы таксама трэці вынік.

7. Яўген Гутаровіч (веласпорт) выйграў этап „Тур Польшчы" ў Катавіцах. Гэта першая ў гісторыі вікторыя беларускіх веласіпедыстаў на адрэзках гонак з серыі „Pro Tour". Працяг адбыўся — у актыве нашага фінішора перамога на другім этапе (173 км) самой „Вуэльты"!

8. Уладзімір Самсонаў (настольны тэніс) стаў пераможцам адкрытага чэмпіянату Паўднёвай Карэі, адолеўшы двух гаспадароў турніру з першай дзесяткі рэйтынгу.

1. Аляксандра Герасіменя (плаванне) спярша абнавіла асабісты рэкорд на дыстанцыі 100 м вольным стылем; гэтага хапіла для сярэбранай узнагароды. А вось на адрэзку ўдвая карацейшым на спіне прадэманстравала свае моцныя якасці і заслужана ўзяла золата (гэта яе найвышэйшы вынік на чэмпіянатах Еўропы) з лепшым часам сезона.

2. Марына Палтаран (веславанне) стала другой на адрэзку 5000 м у байдарцы-адзіночцы.

3. Вікторыя Чайка (кулявая стральба) у Мюнхене паўтарыла свой бронзавы поспех чатырохгадовай даўніны ў практыкаванні з пнеўматычнага пісталета.

4. Надзея Астапчук (штурханне ядра) датэрмінова стала ў сваім відзе пераможцай „Дыяментавай лігі" і ўключана ў зборную Еўропы на Кубак кантынента, што пройдзе 4-5 верасня.

5. Вольга Лешчанка (дзюдо) на этапе Кубка свету ў нямецкім Гамбургу ўзяла трэці прыз у катэгорыі да 48 кг.

6. Вікторыя Азаранка (вялікі тэніс) у фінале турніру з прызавым фондам 700 тысяч долараў у амерыканскім Стэнфардзе адолела Марыю Шарапаву. Гэта яе 4-ы тытул у кар'еры.

7. Меліціна Станюта (мастацкая гімнастыка) на этапе Кубка свету ў Італіі стала трэцяй у шматбор'і і ўзяла адно серабро і дзве бронзы ў асобных відах.

З весляроў варта яшчэ адзначыць экіпаж каноэ-чацвёркі (Дзмітрый Рабчанка, Дзмітрый Вайцішкін, Дзяніс Гаража, Аляксандр Ваўчэцкі). Трэнерам месяца без ваганняў трэба назваць Уладзіміра Шантаровіча, які рыхтуе весляроў экстра-класа.

Цікава, чым парадуе нас верасень?

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Адгалоска

Да „Падводнай лонкі"

Пані рэдактар Міра Лукша апісала ў „Ніве" (25.07.2010 г.) сітуацыю пана Клаўдзія Казберука і іншых, у якой яны выступаюць як пакрыўджаныя жыхарамі вёскі Лука, якія сілай і кулакамі не дапускалі іх да ўласнасці 17 гектараў луга за перыяд 1906-1986 гадоў, гэта значыць за 10 гадоў царскай улады, 20 гадоў II Рэчы Паспалітай, 40 гадоў ПНР (ці ж гэта не нонсенс?) ды што прадалі іх грунт (17 га) і падзялілі грошы паміж сябе. А вось грошы, якія лучане атрымалі як кампенсацыю за луг заліты вадою былі налічаны і выплачаны тым уласнікам, якія былі пайшчыкамі — няроўнымі сумамі, а паводле ўдзелу ў супольнасці. Лука не купляла ніякай зямлі і лугоў, разам ці па-суседску, разам з пералічанымі Казберукамі і іншымі з Лукі ў 1864 годзе атрымалі грунты на падставе царскага дэкрэту разам з дакументацыяй — картамі і планамі ды выразнымі памежнымі знакамі на грунце.

Іншыя закіды, якія ставяцца ў газеце, неістотныя і не маглі прымацца пад увагу за час 80 гадоў. З некаторымі закідамі можна палемізаваць, але мы не будзем. Няхай пан Казбярук сам сабе адкажа, бо мы яму не хочам зашкодзіць. Толькі просім пана Казберука, каб не абвінавачваў жыхароў Лукі ў тым, што яму штось забралі. Проста яго Дзед не ведаў, што купляе, і таму так усё адбылося, як ёсць. Гэта думка і іншых старэйшых жыхароў Лукі, з якімі мы кансультаваліся.

Я. С., М. С.

Канцы ў ваду?

Нядаўна спытаўся ў мне спадар Я. С., якога я сустрэла на адным беларускім мерапрыемстве, ці я бачыла ўсе карты і дакументы наконт згаданай „падводнай лонкі". Мабыць, ён іх не ўсе бачыў на ўласныя вочы, як спадчыннік лучан і іхні прадстаўнік перад уладамі, што іх выкінулі са стагоддзямі абжытай зямлі. Жывыя лучане — ужо лічаныя асобы на гэтым свеце. Хто пайшоў жыць у бандарскія „блёкі", хто ў Новую Луку, хто яшчэ далей ці бліжэй. Не ўсе могуць пацікавіцца, як разлічылася ваша прадстаўніцтва грамады грашыма, якія вам заплацілі за адабраную родную зямельку. Кожнаму крыўдна аддаваць „крывавіцу" сваіх бацькоў за бясцэнак, бо ж не на ўсё ёсць цана. Так, спадар Я. С., карты ёсць, выдзеленая лучанская супольнасць-паша, і луг які купілі продкі м.інш. спадара Казберука. Вы сказалі, што ездзіла ваша дэлегацыя ў гродзенскі архіў, каб знайсці выпіс з кадастравых кніг пра ўласнасць, і быццам не знайшлі выпісу на тыя 17 гектараў. А быццам на рэшту, вашу — ёсць? Няма! З натарыяльнага акту прожаду вынікае, што, як выразна адзначыў натарыус, такога выпісу ў вас няма і не толькі на тыя 17 гектараў, але і ні на вашу рэшту, ні на ўсё разам тое, за што вы прадалі і ўзялі грошы ды мелі іх расплаціць суседзям. Не пароўну, а як вы адзначылі: па паях-удзелах. Разумею, хто багацейшы (хто меў свае зямлі больш), той меў атрымаць больш за свой пай ва „ўспульноце". Не буду распытваць у кожнага жывога лучана ці ў яго спадчынніка, колькі каму прыпала „мокрых" грошай і ці ўвогуле, бо не з'яўляюся нейкім следчым. Дарэчы, мяркую, што вы падзялілі паміж усімі ўсё сумленна, а вас ведаюць не толькі ў Нараўчанскай гміне. Зрэшты, нікому ніхто не хоча зашкодзіць, як Вы адзначылі ў лісце. Гэта ж не проста як камусьці „загарадзіць дарогу на ўласнае поле".

Сапраўды, пяцёрка з Казберукамі „якая не ведала, што купіла" можа гэта і звычайныя дурні, тым больш што непрысутныя рацыі не маюць. Тым больш усе іншыя, бо маўчалі як вады ў рот набраўшы — каб іх не палічылі кулакамі, каб не вылазіць перад маўклівы шэраг, каб не паказваць няслушных — „царскіх" ці „санацыйных" папераў, бо невядома да чаго гэта давядзе. Бо лепш жыць сабе паціху і не нарабіць сабе ворагаў, асабліва на старасць і сярод сваіх людзей. Дзе наша не прападала! Над залітымі палеткамі і лугамі, якіх ужо хіба няварта перамерваць, боўтаецца дзяржаўная вада, якую тым больш ніяк не перамераеш.

Міра ЛУКША

У гасцях у гміне пад пушчай

Міхась КУПТЭЛЬ

Як я маю заахвочваць знаёмых і незнаёмых, каб ехалі актыўна адпачываць у агратурыстычных кватэрах, якіх нямала паявілася ў прыпушчанскіх вёсках Белавежскай пушчы, калі апрача фізічнай актыўнасці, для духу тут няма нічога? Ну, можа апрача сціплай праграмы тэлебачання. Не гавару пра святочны дзень — аб нейкіх фестывалях і юбілеях, пра якія змястоўна пішуць Уладзімір Сідарук у „Ніве" (н-р 33 гэтага года) і іншыя аўтары тыднёвіка. Вядома, такія імпрэзы патрэбныя. „Актыўныя" турысты таксама з цікавасцю ў іх прысутнічалі б, калі б якраз трапілі з тэрмінам свайго водпуску.

Ёсць многа розных турыстычных выданняў, якія проста намаўляюць, каб абавязкова прыехаць вандраваць па веласіпедных сцежках раёна Белавежскай пушчы на ровары, прыкладам *Szlaki rowerowe w Rejonie Puszczy Białowieskiej. Polska — Białoruś. Przewodnik. Wydawca Starostwo Powiatowe w Hajnówce.* Праўда, сцежкі дагледжаныя, — можна па іх ехаць і ехаць, трэба толькі пільнавацца, каб не заблудзіць, калі якраз карту са сцежкамі забудзеш узяць з сабой — затым, прыдаліся б нейкія лясныя ўказальнікі. Калі ўжо „актыўны" веласіпедны турыст праглыне кіламетры дарогі, сярод цудоўнага лесу, у суправаджэнні спеву птушак, хацеў бы прысесці на нейкай лясной лавачцы, адпачыць, пасіліцца або проста паслухаць цішыні пушчы. На жаль, не можа, такіх лясных лавачак няма, прынамсі я такіх у сваёй вандроўцы не сустрэў.

Здарылася, што праліўны дождж не дазволіў катацца па пушчы. Што тады рабіць? Зайшоў я ў гмінны цэнтр культуры, каб пачытаць сваю ўлюбёную штодзённую „ГВ" і, вядома, улюбёную „Ніву" — гэта ж асяродак гміннай культуры, павінен быць цэнтрам культуры не толькі з назвы. Ды дзе там! Не было ў так званай „Кавярэнцы" ніводнай газеты, ніякай прэсы. Дзецюкі на камп'ютары забаўляліся нейкімі гульнямі. Чаму няма ў ГАКу прэсы, ведае пэўна яго кіраўнік. А, можа, войт? Няўжо ў гміне няма пару соцень залатовак, каб падпісацца на нейкую штодзённую, не гаварыўшы пра такую распусту, каб падпісацца на „Ніву"! І то ў гміне, дзе жыве актыўны яе карэспандэнт У. Сідарук.

Неяк, калі шукаў па крамах сваёй „Палітыкі" — па паху разагрэтай гумы трапіў на слаўны „Орлік", пусты, зачынены на велізарны замок. Няўжо няма ахвотных пакарыстацца спартыўным гмінным набыткам? Уся моладзь кудысьці выбыла з гміны? Потым даведаўся я, чаму „Орлік" не працуе. Таму ён закрыты, бо маглі б яго здэваставаць, панішчыць. А так заўсёды будзе акуратны.

Такая гміна! Не дзіўна, што „актыўныя" турысты едуць туды, дзе ёсць не толькі веласіпедныя сцежкі, але ў якой можна купіць газету, не гаварыўшы пра такую раскошу каб „дастаць" „Ніву", і дзе спартыўная пляцоўка даступная ад раніцы да вечара.

Ёсць надзея на асеннія выбары, у выніку якіх гмінамі будуць кіраваць праўдзівыя гаспадары, якія перад усім задбаюць пра сваіх выбаршчыкаў, а потым — пра „актыўных" веласіпедных турыстаў.

„Ніва" дапамагла

Сёлета вясной на старонках „Нівы" крытыкавалі мы шматлікія небяспечныя ўхабіны ў асфальтавай маставой ваяводскай дарогі № 68 з Юшкавага Груда ў Навасады. Гэтая артэрыя бяжыць цераз Новае Ляўкова і тут якраз — перад вёскай, у вёсцы і за ёй — было найгорш.

Пасля нашай крытыкі мінула тры месяцы, а ў канцы ліпеня гэты найбольш выбоісты адрэзак дарогі грунтоўна адрамантавалі. Зараз ад Бандароў у Нараўку ехаць прыемна і бяспечна!

(яц)

Адгаданка



1. металічная пасудзіна з ручкай для напояў, 2. насціл з дошак для спання, 3. цела, 4. вязкае рэчыва для склейвання, 5. супрацьлеглая поўдню, 6. Рычард, амерыканскі прэзідэнт да Уотэргейта, 7. пругкая металічная спіраль, 8. бур, інструмент для свідравання, 9. песнапенне для ўсхвалення святога, 10. паказная раскоша, форс, 11. тонкі празрысты матэрыял, 12. нізкая гліняная пасудзіна з выпуклымі бакамі і вузкім горлам, 13. авечаня, 14. не плоць, 15. пад ляжачы камень не цячэ, 16. чаканне добрай, радаснай падзеі, 17. вырастае з жарабяці, 18. буйная вобласць, 19. штаны з жорсткай баваўнянай тканіны.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Станіслава Леца.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 32 нумара

Макаль, Адам, літаратура, енк, алерген, танбур, вядро, ом, санацыя, Нарач, сын, Ной, Аіда, род, Вінь, рака, красавік, Ява, Нара, ода, ікаўка, ронда, лязо, Марс, княства.

Рашэнне: **Далі табе нямала чарак на твой нацыянальны сон, народ сьвінарак і даярак, народ разяваў і варон.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

РЭПАРТАЖ ПРА КРЫЖ, БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНІ І ДОБРАГА ПАНА ВОЙТА!

(пачатак у № 33)

Да шырэйшага апісання падзеі звязанай з асвячэннем крыжа заставілі мяне тры справы: звестка ад Анны Радзюкевіч пра тое, што ў 1906 годзе праваслаўныя складалі ў Шудзялаве большасць, а пасля быў час, што не было там ніводнага іх аднаверніка. Што такое здарылася ў мясціне, каб перавярнуць дагары нагамі духовы лад у грамадстве? Нават бежанства, якое паглынула трэцюю частку праваслаўных, не нанесла такога разгрому. Людзі вярталіся, адбудоўвалі цэрквы, змагаліся за адабраную маёмасць. Праўда, акты паланізацыі выклікалі нязгоду і ўнутраны

Фота з архіва Востраўскай парафіі

раскол у Царкве. Прыклады вядомыя з бліжэйшага панадворка. Неўзабаве тут, у наваколлі Шудзялава, пачне дзейнічаць секта Ілы Клімовіча, якая намерыцца пабудаваць Новы Іерусалім, сталіцу свету Вершалін. Такія з'явы не бяруцца з падзення духу, хутчэй успыхаюць як бунт у адказ на духовую маніпуляцыю і абыякія замяняльнікі для старой традыцыі.

Царкоўныя дакументы не пацвярджаюць сенсацыі апублікаванай у штомесячніку „Przegląd Prawosławny". Паводле „Кліросных ведамасцей" у 1913 годзе ў самім Шудзялаве жыло адно 47 душ (парафія налічвала 1238 вернікаў). Гэтую сціплую жменьку значна вынішчыла бежанства і ваенныя стыхіі. У 1923 годзе ў Шудзялаве пражывала ўжо толькі дзесяць праваслаўных душ. Запіскі інфармуюць таксама пра пяць асоб, якія асталіся ў Краіне Саветаў. Падобны працэс прайшоў у самай вялікай праваслаўнай вёсцы ў парафіі; калі ў 1913 годзе ў Сукавічах жыло 419 душ, то ў 1923 годзе было іх толькі 176 чалавек. На працягу дзесяці гадоў у Шудзялаўскай парафіі лік вернікаў паменшаў з 1238 да 472 асоб. З другога боку дэмаграфічная сітуацыя не выглядала так трагічна як у наш час (на ўсю гміну асталося ўжо 600 чалавек!). Тыя вернікі, што вярнуліся з бежанства — у 1923 годзе было 766 душ — у спрыяльнай атмасферы сваімі рукамі адбудавалі б пашкоджаную ў час вайны царкву. Супольная праца і ўласны ўклад толькі падмацавалі б дух у народзе. Улады новай дзяржавы мелі аднак свае планы. Ужо ў 1921 годзе парафія ў Шудзялаве была скасавана, а вернікаў, разам з праваслаўнай грамадой з Вострава (там згарэла царква) даклеілі да парафіі ў Юраўлянах.

* * *

Ва ўсім свеце, нават пры самай развінутай ідэі шматкультурнасці і талерантнасці, для рэлігійных ці этнічных меншасцей мала дзе прапануюць месца ў цэнтры, на ўзгорку, на ганаровым месцы. Пры змене ідэалогіі такія будынкі першымі ідуць з агнём або пад развалку. Магчыма, калі б царкву-мураванку пабудавалі ў Сукавічах, найбольшай праваслаўнай вёсцы, яе абмінуў бы жахлівы лёс. Пасля ўзнікнення Польшы легенды пра багатых падарожнікаў-спонсараў з Пецярбурга замест будаваць славу, разбуджалі агрэсію вакол будоўлі. У самім Шудзялаве не было людзей, каб бараніць храм. Перад вачыма ўсё стаіць мне чорна-белы здымак невядомага аўтара, які ўхапіў у кадр момант развалу царквы.

Падобныя сцэны мы спалучаем з агрэсіяй, агнём, хмарамі пылу і друзу. Шудзялаўскі здымак баліць з-за сваёй нармальнасці. Першае, што кідаецца ў вочы — грамадская ініцыятыва і парадак, з якім адбываецца знішчэнне. На нізе падстаўленыя тры яшчэ пустыя фурманкі з драўлянымі коламі. Вакол іх завіхаюцца спрытныя мужчыны сярэдняга ўзросту. Большасць з іх мае на галаве звычайныя шапкі з казырком. Ні адна цэгла ні камень не мае права лабануць згары. Пачуццё бяспекі і парадак унушае зафіксаваная на фатаграфіі ўзорная арганізацыя працы. Кожны займаецца сваім, ніхто нікому не ўваходзіць у дарогу, ніхто не спяшаецца і не дрэмле. Тыя, што ўскараскаліся на сам верх аб'екта, каб зрываць цэглу, напамінаюць постаці з карцін пра Страшны суд. Іх лёгкасць і спрыт маюць у сабе нешта дэманічнае. Там, на высі, няма страху і пагрозы, людзям спрыяе энергія ад аксамітнай атакі знішчэння. Пакуль цэгла з вяршын апынецца на нізе ў возе, пяройдзе яна праз трыццаць пар рук. На зямлі, ля фурманак ужо зачакаліся. Магчыма, каб збіць час і пачуццё віны, апавядаюць сабе былі і анекдоты. Хваляць розум ксяндза Ігната Троскі і яго залатую здзелку. Ксёндз прадаў стары драўляны будынак касцёла за 5750 злотых і купіў ад праваслаўных за 700 злотых царкоўныя муры — гурбу першакласнай цэглы. Збудуюць з яе прыгожы касцёл на ўзгорку пад лесам, каб кожны, хто будзе ісці або ехаць крынска-шудзялаўскім гасцінцам, мог захапляцца.

* * *

Калі прыгледзецца рэлігійным абрадам Шудзялаўскай зямлі, словы пра любоў і братэрства тут не навізна. Пасля Брэсцкай уніі тутэйшыя каталікі і ўніяты маліліся ў адной Свята-Спасаўскай царкве, якая стаяла на ўзгорку ў цэнтры. Таксама на адным могільніку хавалі пакойнікаў. Праўда, шудзялаўскіх уніятаў настолькі аблатынізавалі, што яны самі выступалі супраць візантыйскіх традыцый. Трыста гадоў таму няшчасцям таксама спадарожнічалі легенды пра багатых наведвальнікаў з праваслаўнага ўсходу. Вось і ў пачатку XVIII стагоддзя Самуіл Масціцкі, старадубскі абозны меў захапіцца іхняй зямелькай ва ўрочышчы Самагруд і запісаў грошы на пабудову царквы, могілак, плябаніі і куплю царкоўнай зямлі. У кантракце фундатар адзначыў, каб імша за памерлых служылася на славянскай мове. Апошняя справа настолькі ўзбударажыла шудзялаўскага адміністратара, ксяндза Кжыштафа Бароўскага, што давяла да насілля і судовай справы. У 1713 годзе настаяцель самагрудскай царквы Міхал Паплаўскі паскардзіўся на шудзялаўскага пастыра, які сабраў чэлядзь і наехаў яго плябанію, прымяняючы мардабой і гвалт на яго сям'і.

У час працэсу ксёндз Бароўскі яўна дэманстраваў сваю варожасць да недастаткова аблатынізаваных уніятаў: tych bambizów popów, którego spotkawszy gdziekolwiek jako psów będziemy zabijali...

За самагрудскім свяшчэннікам, як сведчаць крыніцы, заступілася наваколь-ная шляхта, дваццаць асоб паставіла свае подпісы ў абарону недастаткова златынізаванага ксяндза Паплаўскага.

(працяг будзе)

05.09 — 11.09

(22.03. — 20.04.) 8-12.09. дагаворышся з партнёрам і знойдзеш кампрамісны выхад з кожнай сітуацыі. Маладзік Месяца (8.09.) усвядоміць табе, наколькі ты залежны ад іншых. Будзеш адчуваць сябе молада, незалежна ад узросту.

(21.04. — 21.05.) Пакажашся з як найлепшага боку. Будуць цябе проста расхліваць. 5-9.09. абмінай людзей, якія калекцыяніруюць здабычы а пасля іх кідаюць. З 10 (да 14.09.) будзеш як магніт прыцягваць супрацьлеглы пол.

(22.05. — 22.06.) Візіт у касметолага (8.09.) давядзе да ашаламляючага выніку. 5-9.09. асоба, з якой супрацоўнічаеш, усхвалюе твой спакой; у цяжкія хвіліны разлічвай на сям'ю і сяброў. Пасля 8.09. пакарыстайся паслугамі добрага масажыста.

(23.06. — 23.07.) Да 7.09. Венера паможа табе залечыць раны і забыцца аб прыкрым мінулым. Пабачыш, як многа ў цябе магчымасцей! Дзякуючы маладзіку Месяца ў знаку Дзевы (8.09.) у другой дэкадзе верасня зможаш пераканаць кожнага. Твая інтуіцыя паможа табе дасягнуць мэты. 11.09. — бура з перунамі ў пары.

(24.07. — 23.08.) Знакаміты час на падарожжы (варта паехаць у месцы з дзяцінства). Цеплыня і сардэчнасць. Пачуцці, якія акажаш людзям, вернуцца да цябе ўдвая. 10-23.09. не будзь хвальком, бо хтось табе дасць па носе; не павучай іншых.

(24.08. — 23.09.) Думаеш пра грошы, іншыя справы пойдуць на другі план (што ўзлуе блізкіх). 8.09. усё будзе табе ўдавацца. Аформіш кожную справу, дагаворышся з кожным. 5-9.09. пазбягай падпісвання дамоў, бо будзеш лёгкай здабычай для абманшчыкаў.

(24.09. — 23.10.) Вельмі добры месяц! Паявяцца новыя весткі ў справе, на якую ты ўжо не спадзяваўся. Да 7 верасня паявяцца новыя перспектывы. З 10.09. (да 14.09.) выкарыстай добры час і дзейнічай; спытайся ў сябе, чаго прагнеш і заваёўвай свет! 5-9.09. будзеш прачулены і раздражнены, бо хтось цябе падмане.

(24.10. — 22.11.) Пагадзіся за зменамі, бо яны неабходныя. Толькі не стаўся негатыўна да іх, бо змена — адна з лепшых і важнейшых спраў у жыцці. З 8.09. — пры Венеры! — цешся хвілінай; інтэнсіўныя і энтузіястычныя перажыванні. Твае козыры — самаўпэўненасць і бравасць.

(23.11. — 22.12.) Бузеш дзейнічаць пад уплывам эмоцый. Ад 9.09. паставіш завысока сабе перакладзіну; не пераборшчвай! Выкарыстай час на рэгенерацыю сілы. Калі пагоршыцца настрой, схадзі да лекара. Кніжка або часопіс аб натуральных метадах лячэння і здаровым жыцці будуць пераломнымі!

(23.12. — 20.01.) Набярэшся сілы, разгрузішся. Некаторыя твае мары здзейсняцца хутчэй, чым думаеш. Неабдуманыя рашэнні могуць аказацца вельмі каштоўнымі. Не спяшайся і не слухай людзей, якія не жадаюць табе дабра.

(21.01. — 19.02.) Многа шчасця ў асабістым жыцці і ў прафесіі. Поспех прыйдзе хутчэй чым спадзяешся. Варта табе прысвяціць час хоць аднаму свайму творчаму таленту.

(20.02. — 21.03.) Расквітнее кампанейскае жыццё. Добры настрой, аптымізм. Паявяцца новыя людзі, а тыя якіх ведаеш пакажуцца з зусім іншага боку. 8-12.09. будзеш сабраны, удасца ўсё што заплануеш. Глядзі ў будучыню: перад табою многа карысных змен. Шанцы на поспехі на працы. Спакойна рабі сваё. Нечаканы збег акалічнасцей (9.09.) можа нарабіць у тваім жыцці шмат замяшання.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960